


Andrej Chadanowicz

ŚWIĘTA NOWEGO ROCKU

KOLEGIUM EUROPY WSCHODNIEJ
IM. JANA NOWAKA-JEZIORAŃSKIEGO

ŚWIĘTA NOWEGO ROCKU

W kraju, gdzie chamuła naciska na hamulec;
gdzie jedno święto się cztery razy w roku świętuje,

by jak narkoman odlotu doznawał człowiek każdy
na dźwięk nowej ciągle Nowego Roku nazwy;

gdzie śnieżnej baby uśmiechem fortuna cię obdarza
„niech wam się darzy" z witryn sklepowych jak z ołtarza;

nie widzisz tego, do Karagandy mknąc na reniferach,
gdy Dziadek Mróz brodą z waty twoje ślady zaciera.

I blask północny w oczach, gwiazdy polarnej błysk szczery,
na saniach świętego Mikołaja same obce numery.

I starą pastorałkę na Nowy Rock chcesz przełożyć.
Śpiewałbyś ją, gdyby nie północ i minus siedem na dworze.

Na pozostałe pół życia tę północ zachować pragniesz.
Nazajutrz w żłobku odświętnym – dzieciątko, wół oraz jagnię.

Lulaj lulaj maleńki Jezusie,
lulaj w Betlejem i na Białorusi.



Андрэй ХАДАНОВІЧ

КАЛЯДНЫ РЭП



Andrej CHADANOWICZ

ŚWIĘTA NOWEGO ROCKU



Kolegium Europy Wschodniej
im. Jana Nowaka-Jeziorańskiego
Wrocław 2012



Seria „Biblioteka Białoruska”
ukazuje się pod patronatem
Ministra Kultury i Dziedzictwa Narodowego RP

Tytuł oryginału
Калядны рэп

Przekład
Katarzyna Bortnowska, Leszek Engelking, Jan Maksymiuk,
Adam Pomorski, Bohdan Zadura

Logo serii oraz projekt okładki
Marek Stanielewicz

Rysunki
Andrej Pakrouski („Czkaława”)

Redaktorzy serii
Lawon Barszczeuski, Jan Andrzej Dąbrowski

Redakcja
Agnieszka Kondek

Opracowanie typograficzne
Maciej Szłapka

Wydanie II

ISBN 978-83-61617-33-4 (elektroniczny)

Przygotowanie do druku
Pracownia Składu Komputerowego TYPO-GRAF

Druk i oprawa
Print Group Sp. z o.o.

Kolegium Europy Wschodniej
im. Jana Nowaka-Jeziorańskiego
www.kew.org.pl

JECHAĆ DO MIŃSKA…

Na ogół życie dyktuje taką kolejność rzeczy: czytam wiersz, albo tom wierszy i zastanawiam się – jeśli sprawa nie dotyczy duchów umarłych – kim jest autor ? Czy w ogóle chciałbym go poznać, ujrzeć, porozmawiać o poezji, seksie, podróżach, polityce, piłce nożnej, czy ja wiem jeszcze – no tak, co sądzi o stałej Plancka, czyli rozmiarach filigranowej kulki materii przed Wielkim Wybuchem?

Tym razem jednak los spłatał mi figla: pewnego razu poznałem Andreja Chadanowicza jako Andreja Chadanowicza właśnie: siedzieliśmy popijając piwo, rozmawialiśmy o tym i owym, ale nic o twórczości gościa z Białorusi nie wiedziałem – ba – nie zdawałem sobie nawet sprawy, że siedzę sobie i właśnie gadam z jednym z najwybitniejszych poetów młodej generacji naszych wschodnich sąsiadów.

Powiem od razu: zrobił na mnie świetne wrażenie: niemal w każdej sekundzie rozmowy skłonny do uprawiania językowych kalamburów i żartów, poważny w pryncypiach sztuki, niezwykle oczytany w całej europejskiej tradycji, bardzo też otwarty na dialog: inteligentny i sympatyczny. Ktoś, z kim chciałoby się podróżować dookoła świata w 80 dni. Było to w Sejnach, w knajpce miejscowego Domu Litewskiego, gdzie spotkali się ludzie najrozmaitszych pogranicz, zaproszeni przez Małgorzatę i Krzysztofa Czyżewskich.

Odsłona druga mojej znajomości z Andrejem, nastąpiła za pośrednictwem telewizyjnego ekranu: nasza jedynka nadała reportaż z warszawskich dni kultury białoruskiej, gdzie Andrej wypowiadał się do kamery, między innymi o roli poety i poezji w swoim kraju.

Bardzo mnie poruszyło to co powiedział: żadnych nie było w tym lamentów, czy politycznych gier, ale podstawowa (i bliska mi osobiście) prawda: Poeta jest stróżem słowa, ogrodnikiem języka. Jego miejsce we wspólnocie wyznaczane jest rzetelnością jego rzemiosła, sztuki którą wykonuje. A przecież kontekst wypowiedzi (i uprawiania poezji na Białorusi) był i jest dramatyczny: język białoruski jest w ojczyźnie Andreja spychany do roli drugorzędnego narzecza. Nawet w sądach zdarzają się sceny, gdy z sądzącego składu, mającego wydać

wyrok na niezależnego dziennikarza – nikt nie umie mówić po białorusku, wszyscy natomiast żądają od podsądnego, aby biegle odpowiadał na pytania po rosyjsku.

Trzecie spotkanie z Andrejem odbyło się w Gdańsku. Przyjechał tu na parę dni z „latającym liceum", którego jest profesorem. Latającym, ponieważ ta jedyna w Białorusi szkoła średnia z wykładowym językiem białoruskim – zamknięta została oficjalnie trzy lata temu. Niestety – żałuję tego do dzisiaj – akurat wyjeżdżałem na wakacje i nie miałem dla Andreja tyle czasu, ile należałoby poświęcić tak znakomitemu gościowi. Ale posiedzieliśmy w knajpce nad Motławą, znów – jak w Sejnach – wypiliśmy piwo i rozmawialiśmy o życiu i pisaniu. Wówczas Andrej podarował mi swój białoruski tom poezji i numer znakomitego pisma literackiego „Arche", którego jest stałym autorem. Już po spotkaniu, przedzierając się mozolnie przez alfabet i słownictwo białoruskie, odczułem pewien rodzaj wstydu: Andrej mówi płynnie po polsku, moja zaś znajomość jego języka i kultury – tak przecież nam bliskiej – jest – jak u większości moich rodaków – znikoma.


Z tym większą przyjemnością piszę więc tych parę słów do pierwszego, przetłumaczonego na język polski tomu wierszy Andreja Chadanowicza.

Czytelnik znajdzie w tych utworach zarówno bardzo osobistą ironię i poczucie humoru Autora, gęste poetyckie obrazy, które zapamiętuje się na długo po lekturze wierszy (na przykład Eurydyka w mińskim metrze), a także przefiltrowany przez literacką wrażliwość obraz współczesnej Białorusi: dziwnej mieszanki internetowego czatu z kołchozowym świętem na cześć pana prezydenta. Jedyne, co chciałbym dodać – zachęcając Polaków jak najgoręcej do obcowania z tą poezją, to przeświadczenie, że dopóki tacy Poeci jak Andrej Chadanowicz piszą po białorusku, kraj ten ma przed sobą przyszłość i perspektywy, jakkolwiek daleko nie byłoby owo przysłowiowe światło w tunelu.

Paweł Huelle

ALBA ALBARUTHENICA

АЛЬБА АЛЬБАРУТЭНІКА



ДЭЖА ВЮ

ажываюць пэрсанажы анэкдотаў
з падсьвядомасьці выходзяць на пленэр
зноў матросаў закрывае дзіркі дотаў
зноўку бацьку падстаўляе піянэр

льлецца песьня на далёкім пагранiччы
у чальцоў кпсс пайшоў працэс
мудры чукча запалярны паляўнічы
стаў на лыжы з групэнфюрэрам эсэс

падрывае партызан цягнік варожы
ў акупантаў пэрманэнтны пераляк
іх чакаюць ваяры на раздарожжы
тры танкісты рускі немец і паляк

прыхадзеце сёньня ў танку будуць танцы
баявік ужо ўзышоў на бранявік
пралятае на тачанцы-растаўчанцы
кат катоўскі энэргічны сілавік

камікадзэ супраць шашкі скача боса
куля дура камандарма не чапай
ардынарац пецька тройчы выдаў боса
крыкнуў певень і на дно пайшоў чапай

але прывід камунізму тут ня вымер
ён глядзіць з чырвоных зорак п'яны ў дым
і ваван валодзя вовачка ўладзімер
назаўсёды застанецца маладым

арляняты гэй шыхтуйся ў шчыльны шэраг
паляцім куды ня ходзіць наш цягнік
як ня згубімся? элемэнтарна шэрлак
нас чакае дасканалы праваднік

верным шляхам запаветамі дэ сада
верным шлюхам не застацца сёньня збоч

DÉJÀ-VU

zmartwychwstają anegdoty i kawały
podświadomość reaguje na cytaty
złota gwiazda świeci znów na polu chwały
dzielny pionier czci donosem powrót taty

na dalekim pograniczu grzmi katiusza
w partii wicie rozumicie trwa kampania
na wojenkę znów beznogi lotnik rusza
mądry czukcza gruppenführer i kompania

partyzanci podejmują walkę z wrogiem
okupanci w permanentnej drżą histerii
na rozstajach na nich czają się za rogiem
wszyscy święci stirlitz kloss czterej pancerni

wódz zaprasza dzisiaj w tanku będą tańce
już bojówkarz peroruje na pancerce
i marszałek galopuje na taczance
a dzierżyński serce ma i patrzy w serce

błędnym kulom się nie kłania nostra kosa
nie dotykaj komandarma rykoszecie
trzykroć już ordynans pietka zdradził bossa
i kur woła i czapajew tonie w lecie

ale widmo komunizmu nie zginęło
z gwiazd czerwonych zerka w dół urżnięte w trupa
włodzimierza włodka włodzia wielkie dzieło
zachowuje wieczną młodość i rżnie głupa

hej sokoły szyk zewrzyjmy na obłoku
nie zna granic ni kordonów marsz lotnika
a gdzie droga? droga prosta mój sherlocku
mamy przecież najlepszego przewodnika

droga prosta i tablice praw de sade'a
z prostej drogi nawet kurwa dziś nie zboczy

па вальпургіевай ночы шахразада
будзе вам варфаламееўская ноч

хто ідзе? штандартэнфюрэр із штандарам
прапар з прапарам выходзіць на прасьцяг
шпаркім крокам проста ў будучыню шпарым
па кастрышчах па касьцёлах па касьцях


ананасы із шампанскім будуць нашы
хто ня з намі пасьмяротна стане наш
ажываюць пэрсанажы пэрсанажы
трыюмфуе неўміручы пэрсанаж

noc walpurgi sabat wiedźm szeherezada
w noc świętego bartłomieja przeistoczy

a tam kto? standartenführer ze sztandarem
błysnął nam słoneczny znak na wysokościach
równaj krok idziemy w przyszłość szlakiem starym
marsz po trupach po kościołach i po kościach

w grobie leży ale do nas świat należy
kto nie nasz musi po śmierci naszym zostać
zmartwychwstają legendarni bohaterzy
święci triumf nieśmiertelna pewna postać

Przełożył Adam Pomorski



КАЛІ РАЗГУЛЯЕЦЦА...

Люблю навальніцу на сьвята працоўных,
калі разгуляецца ў небе пярун,
а тут, на зямлі, із стыхіяй на роўных,
свой верш прамаўляе паэт-гаварун.

Нябёсы маланкай міргнуць дабрачынна,
вясновую зьліву ўзмацніўшы ўтрая, –
прамокне наскрозь чарнявая дзяўчына,
прынада, прынада, прынада мая!..

Да хаты вяртаецца ўдзячная моладзь
зь дзіцячых садкоў беларускіх і школ,
нябёснага бацьку ў Жыровічах моляць,
каб шчасьце ды мір панавалі вакол.

На ўсходзе даўно не здаралася путчаў,
на захадзе хутка дазволяць аборт,
а шчасны паэт, не раўнуючы Цютчаў,
чакае натхненьня, пускаючы „word".

Ён будзе пяяць пра сюжэт старадаўні.
Пра іншае, дружа, пакуль памаўчы!
Як кожнага году на першага траўня,
галоўнае сьвята пачнецца ўначы.

Курган векавечны амаль раскапаны,
і хутка натоўп неразумных хазар,
вампіры і ведзьмы, залётнікі й панны,
калёнай памкнуць на славянскі базар!

Сябрына на шабаш, бы спожыць у кайстру, –
бязь лебедзяў чорных і белых варон.
І кожнай Мальгрэце – асобнага Майстра,
і кожнаму Фаўсту – уласны патрон.

Шатаны, анёлы, багі, дэміургі,
прыходзьце, нясеце дары ў дарасхоў:
зямля беспасажна-цнатлівых Вальпургій
дагэтуль чакае сваіх жаніхоў!

KIEDY SIĘ ROZHULA…

Tak lubię w święto ludzi pracy burzę,
kiedy się niebo gromami rozhula,
a tu na ziemi – głos w żywiołów chórze –
swój wiersz układa poeta-gaduła.

Gdy niebo szczodrze błyskawicą pęknie,
ulewa chluśnie w wiosennych przybojach, –
czarnulka dziewczę przemoknie doszczętnie,
pokusa, pokusa, pokusa moja!..

Do domu wraca wdzięczna, roześmiana
młódź z białoruskich szkół oraz przedszkoli.
Zaś w Żyrowiczach modlą się do Pana,
by w kraju szczęścia każdy miał do woli.

Na wschodzie dawno już nie było puczu,
da na aborcję zachód przyzwolenie,
a wieszcz szczęśliwy, twój prywatny Tiutczew,
włączając Worda, czeka na natchnienie.

Pradawnym wątkiem będzie się upajał.
Co do innego, to dziś, druhu, zmilcz to!
Jak co rok nocą na pierwszego maja
zaczyna się centralna uroczystość.

Kurhan wiekowy prawie rozkopany,
wnet nierozumnych Chazarów gromada,
wampiry, wiedźmy, uchodźcy i panny,
kolumną ruszą na słowiański bazar!

Zgrana kompania na sabat się zlata –
bez białych kruków, bez czarnych łabędzi.
Własnego Mistrza każda Małgorzata,
i panzerfausta każdy Faust mieć będzie.

Szatany, bogi, anioły, demiurgi,
nieście do skarbca swe dary z daleka:
ziemia dziewiczych, bez wiana, Walpurgii
wciąż jeszcze na swych narzeczonych czeka!

Przełożył Bohdan Zadura

* * *

Час перайсьці ад словаў да явы
(раяць курцы і матацыклісты),
толькі прыходзіць сон мой яскравы,
зыркія словы ў золак імглісты.

Ён наплывае, нібы знадворку,
покуль чуйную ў вадах і хібах.
Распачынае зьліва гаворку,
першыя кроплі граюць на шыбах.

Дэсантавацца ў сярэдзіну зьлівы,
высьніўшы словы, выславіць сон,
кінуўшы вонкі ў горад дажджлівы
свой параплаў, парашут, парасон.

Недзе на біржах падаюць баксы,
недзе на ладан дыхае Ўсама,
менскаю зьлівай дыхаюць таксы,
мокрыя таксы
й таксісты
таксама.

Толькі ўмыкнеш электронны папірус,
вецер ляціць шалапутны і файны:
як найнавейшы кампутарны вірус,
кружыць над местам усе тваe файлы.

Марна купляеш маркі й канвэрты,
марна чакаеш паслуг інтэрнэту.
Сеціва ўрыўкі лятуць у паветры –
пазачарговае бабіна лета...

Сьпелячы словаў смачныя сьлівы,
дыхаеш воляй – пад рэбрамі коле.
Дыхаеш зьлівай, дурань шчасьлівы,
мроячы не прачынацца ніколі.

* * *

czas odpowiednie słowu dać rzeczy
i wszystkie nocne pożegnać sprawy
lecz barwnym słowem sen jawie przeczy
zwłaszcza o szarym świcie jaskrawy

napływa na mnie z dworu jak gdyby
rachunki błędów i krzywd mi gmatwa
już pierwsze krople bębnią o szyby
rozmowa z deszczem bywa niełatwa

czas sen wysłowić wyśnionym słowem
i pod osłoną deszczu po nocy
pod parasolem spadochronowym
udzielić miastu bratniej pomocy

zielone lecą na łeb na szyję
hajda al-kaida zdychaj osama
mińsk powie taksiarz
ulewą żyje
kurs się nie zmienia
taksa ta sama

elektroniczny klikniesz papirus
już wiatr zaczyna swoje wybryki
i już nad miasto jak nowy wirus
wirem ci z dysków porywa pliki

e-mail nie działa w krainie cieni
nie nadlatuje poczta skrzydlata
wirują strzępy sieci w przestrzeni
jak coś w rodzaju babiego lata

składaj soczyste i słodkie słówka
wdychaj tę wolność aż serce ściśnie
oddychać deszczem radość półgłówka
co o śnie wiecznym marzy bezmyślnie

Przełożył Adam Pomorski

АЛЬБА АЛЬБАРУТЭНІКА

я стаю пры тваім акенцы
і пяю табе сэрэнаду
ты ў акне ў празрыстай сукенцы
мне гаворыш *мальчык ня нада*

я ж чаканю рым дубальтовы
й не пайду да ранку дамоў
на ўсіх мовах пяяць гатовы
(ты ня ведаеш гэтых моў)

па-японску як такубоку
па-кітайску як сам лі бо
я кахаю цябе глыбока
ты прымі гэту альбу альбо

засьпяваю новыя альбы
я давёў іх сёньня да ладу
перайду для цябе цераз альпы
і складу ня альбу баляду

эх пакласьці цябе на раяль бы
і такую ўчыніць карусэль бы
я цябе апяваю ў альбе
гэта як сустрэча на эльбе

гэта варта вершаў і прозы
й трызьняць альбаю ў неспакоі
альбіносы і альбатросы
альбігоі і проста гоі

напісаць пранізьлівы вершык
пра любоў пад мастом мірабом
зрымаваць традыцыйна зь „вершнік”
і пакінуць табе ў альбом

падбіраць беларускія словы
і крычаць іх адно табе

ALBA ALBARUTHENICA

pod twym oknem biała panienko
stoję śpiewam ach serenada
masz na sobie sukienkę cienką
przestań mówisz malczyk nia nada

a ja śpiewam w podwójnym rymie
przez noc wielką jak jesień ludów
w stu językach śpiewam twe imię
(stu języków nie znasz bez cudów)

jak li bo i jak takuboku
twój japoński chiński hidalgo
kocham ciebie w świetle i w mroku
przyjm tej nocy tę albę albo

jeszcze inne ułożę alby
doskonalsze o kurczę blade
ja dla ciebie przekroczę alpy
i alpejską stworzę balladę

ale bal byłby ale bal by
aż by ci się robiło słabo
śpiewam tobie dla chwalby alby
to jest jak spotkanie nad łabą

że to godne wiersza i prozy
nucą alby jak wniebowzięci
albinosy i albatrosy
albigensi i zwykłe gęsi

miłość pod mirabowym mostem
opiewając w rzewnej zadumie
rymem tradycyjnie zbyt prostym
chcę uwiecznić w twoim albumie

w białoruskim języku czystym
bez domieszek i bez mieszańców


зразумелыя да паловы
і ня ўсім жыхаром эрбэ

у парыве літаратурным
барукацца зь дзявочым сном
трубадурам не трубадурнем
пад тваім замкнёным акном

półczytelnym na gruncie ojczystym
i to nie dla wszystkich mieszkańców

wielbić świętą literaturę
i dziewczęce sny płoszyć z wdziękiem
jak trubadur nie trubadureń
pod zamkniętym twoim okienkiem

Przełożył Adam Pomorski



ЛІСТ НА СВАБОДУ

Мы пакуль не народжаны народ,
мы вязьні скамянелых яйцаклетак,
мысьленча запаволены чарот;
хтось падла, хтось зусім яшчэ падлетак,

хтось піша і рыторыкай старой
уводзіць юнакоў у заблужджэньне:
змагар, руплівец, ходаньнік, герой,
тытан, а мо й тытанік адраджэньня.

Стаміліся й губляем лік гадам:
гады ў турме паўзучыя, як гады!
Дзе ж тая паўнагрудая мадам,
што ўсіх нас павядзе на барыкады?

Што маем, ёй бы кінулі да ног!
І вартавыя чуюць нашы енкі,
калі начамі ў каляровых снох
мы бачым гэту кралю без сукенкі.

Мы валім дрэвы, чэшам камяні,
капаем катлаваны і каналы,
чакаем на спатканьні, лічым дні
й абагаўляем сьвет наш дасканалы.

Бо верым: навакольнае лайно
цудоўным гноем станецца ў гасподзе.
Папраз закратаванае акно
гартуем дых, каб дыхаць на свабодзе.

LIST NA WOLNOŚĆ

My, jeszcze wciąż nie narodzony naród
z trzciną, myślowo opóźnioną, w godle,
w więzieniu jaja skamieniały zaród,
podlotek z padłem pojednany podle,

i kultywator retoryki starej
mamiący młodych: pełen poświęcenia
działacz i piewca wiary i ofiary,
ów tytan (lub tytanik) odrodzenia.

Męczymy się, gubimy lat rachubę:
w więzieniu rok nie wyrok, nie ma rady.
Gdzież ta madame piersiasta, dziewczę lube,
które powiedzie nas na barykady?

Cokolwiek nasze, wszystko dla niej w darze!
Wsłuchują się strażnicy w nasze jęki,
gdy w barwnych snach co noc jak kajdaniarze
widzimy tę ślicznotkę bez sukienki.

Drzewa by raczej rąbać, tłuc kamienie,
tunele kopać, doły i kanały:
liczymy dni, czekamy na widzenie,
wielbimy świat w tych ramach doskonały.

Wierzymy, że to łajno dni codziennych
w nawóz się zmieni niby mączka z kości.
Łykiem powietrza spoza krat okiennych
uczymy się oddychać na wolności.

Przełożył Adam Pomorski

ГАРЫ ПОТЭР, ЛІЦЭІСТ

Я нарваўся на шалёных троляў на польскай мяжы ды
ў Менску крыху не паразумеўся ў бары з вампірам –
а так усёнька было гладка...

Дж. К. Роўлінг, *Гары Потэр і Ордэн Фэнікса*

Гары Потэр, выдатнік у гуманітарным ліцэі,
пераможца на алімпіядах па бел-чырвона-
белай магіі, зноўку ў пошуках панацэі:
дух закону ці – па традыцыі – зуб дракона?

Бо ў газэтах вусаты гоблін з кілішкам жытняй,
над мяжою ў паветры вісяць птушыныя коркі,
пошту з выраю рэквізуюць ужо на мытні
то шалёныя тролі, то оркі з Мар’інай Горкі;

бо дарога даўгая й рэкляма задарагая,
бо сышлі ў шоў-біз настаўнікі ды сяброўкі,
бо чырвона-зялёная магія перамагае
й цуда-зёлкі ідуць на экспарт у складзе зуброўкі;

бо чароўнаю палачкай стаўся дручок гумовы
й барада тэрарыста-джына прамокла да ніткі,
бо ў астатніх школах ня вучаць птушынай мовы,
а палёты на памяле спыняюць зэніткі;

галасы аднадумцаў гучаць з кожным днём ахвярней,
і штодня складаней трымацца нэўтралітэту,
жлукціць безалькагольнае піва ў таннай кавярні
ў атачэньні занудаў з варожага факультэту...

Закаркоўвае пляшку й выходзіць на ліпеньскі водар.
Сквэр Марата Казея, а ў пляшцы – кактэйль для цьвярозых.
Ён, вядома, ізноў пераможа, бо ён Гары Потэр,
ратавальнік вялікіх дзяцей і маленькіх дарослых.

HARRY POTTER, LICEALISTA

Wpadłem na złośliwych troli na polskiej granicy
i zaliczyłem małe nieporozumienie z wampirem w barze w Mińsku, poza tym wszystko poszło gładko...

J. K. Rowling, *Harry Potter i Zakon Feniksa*

Harry Potter, prymus z tajnego liceum,
zwycięzca olimpiad z biało-czerwono-białych
guseł, znów wyrusza szukać panaceum:
smoczego zęba czy ducha dla odrętwiałych?

Bo z gazet wąs stroszy goblin z setką żytniej,
w powietrzu nad granicą kraczą wronie chórki,
przesyłki zza morza konfiskują sprytnie
celnicy-trolle z orkami z Maryjnej Górki;

bo daleki szlak i reklam koszt przeraża,
mentorzy i sympatie robią w show-businessie,
bo czerwono-zielony czar przeważa,
zaś zioła są w eskport żubrówce, a nie w lesie;

bo magiczną różdżką dziś jest pręt gumowy,
na wskroś przemokły brody terrorystów-dżinów,
bo inne szkoły nie uczą ptasiej mowy,
a w lotników na miotłach walą z karabinów;

głosy przyjaciół brzmią z każdym dniem ofiarniej
i coraz trudniej nie mieć całkiem w tym udziału
pijąc piwo bezprocentowe w kawiarni
i słuchając nudziarzy z wrogiego wydziału...

Wciska korek w szyjkę i rusza spacerem
z koktajlem ognistym dokąd nogi poniosą.
Znowu zwycięży, bo jest Harrym Potterem,
wybawcą dużych dzieci i małych dorosłych.

Przełożył Jan Maksymiuk

ВАЛАСЫ-2006

ціхі анёл праляцеў
над гняздом зязюлі


яшчэ адзінаццаць тысяч
тваіх маладых суайчыньнікаў
за цэлы год
не пагядзяць ніводнага фільма
Мілаша Формана

WŁOSY – 2006

cichy anioł przeleciał
nad kukułczym gniazdem

jeszcze jedenaście tysięcy
twoich młodych współrodaków
przez cały rok
nie zobaczy nawet jednego filmu
Milosza Formana

Przełożył Bohdan Zadura



КАМАРЫ ДУМАЮЦЬ ПРА БЕЛАРУСЬ

Ігару Бабкову, таварышу ў няшчасьці

Калі Пан Бог
у першыя шэсьць дзён тварэньня
стварыў бы й камароў,
мабыць, у сёмы
Ён бы ўжо нармальна не адпачыў.

І праўда,
якая тут міласэрнасьць
і любоў да ворагаў
нашых меншых,
калі цябе кусаюць
у правую шчаку,
а ты рэфлекторна
пляскаеш і па левай?!

...Паход у лясы
пачаўся з выправы
на Камароўку,
і гэта было знакам,
якога, на жаль,
ніхто не расчытаў.

Недааценілі мы й першых налётаў,
не абвесьціўшы ўчасна
паветранае трывогі.

А потым пачаўся Пэрл-Харбар,
бязьлітасны й бессэнсоўны,
як усякі бунт
супраць Вялікага Брата,
які хоць і бачыць цябе,
але ж ніяк не пасьпявае
са сваёю груваасткаю
супрацьпаветранай абаронай,
бо адзіны ў атрадзе „зэнітчык”
узброены толькі фотаапаратам.

KOMARY TROSZCZĄ SIĘ O BIAŁORUŚ

Iharowi Babkowowi, towarzyszowi w nieszczęściu

Jeżeli Pan Bóg
w ciągu sześciu dni tworzenia
stworzyłby komary,
z pewnością siódmego dnia
już by po prostu nie odpoczął.

I prawdę mówiąc,
jakie tu już miłosierdzie
i miłość do nieprzyjaciół
naszych mniejszych,
jeśli gryzą cię
w prawy policzek,
a odruchowo
bijesz też po lewym?

…Pochód do lasu
zaczął się od wyprawy
na bazar Komarowka,
i to był znak,
którego, niestety,
nikt nie odczytał.

Nie doceniliśmy również pierwszych nalotów,
nie ogłosiwszy w swoim czasie
alarmu lotniczego.

A potem zaczął się Pearl Harbour,
bezsensowny i bezwzględny,
jak każdy bunt
przeciw Wielkiemu Bratu,
który chociaż nawet ciebie widzi,
to jednak w żaden sposób nie zdąża
ze swoją ciężką
artylerią przeciwlotniczą,
jeżeli jedyny w oddziale celowniczy,
uzbrojony jest tylko w aparat fotograficzny.

„Мабыць, хутка ўжо канец сьвету”, –
казалі ў роспачы пэсымісты,
а хтось асабліва цынічны дадаў:
„Ня мы, дык нашыя дзеці дачакаюцца!”

Побач курылася вогнішча,
а ты падскокваў, нібы кенгуру,
і размахваў рукамі, як вятрак,
калі цэлае воінства
абкураных рыцараў
ідзе на яго сьвіньнёю...

Ды ўрэшце настае пара,
калі бярэш пару пляшак
і на пару хвілінаў
забываеш пра іхнае існаваньне,
альбо нават думаеш,
што чарговая атака
такі захлынулася ў тваёй крыві,
і верыш – вось яна, перамога,
і на поўныя грудзі крычыш:
„Жыве Беларусь!”
І чуеш у адказ радаснае
„З-з-з-з-зыве!”

“Widać, koniec świata już blisko”
w rozpaczy mówili pesymiści,
a ktoś szczególnie cyniczny dorzucił:
“Jak nie my, to nasze dzieci się doczekają!”

Obok dymiło ognisko,
a ty podskakiwałeś, jak kangur,
i wymachiwałeś rękami, jak wiatrak,
kiedy całe wojsko
obkurzonych rycerzy
rusza na nie w postaci świni…


Ale w końcu nastaje pora,
kiedy po paru flaszkach
na parę minut
zapominasz o ich istnieniu,
albo nawet myślisz,
że kolejny atak
mimo wszystko załamał się w twojej krwi,
i wierzysz – oto ono, zwycięstwo,
i krzyczysz na całe gardło:
„Białoruś żyje!”
I w odpowiedzi słyszysz radosne:
„Z-z-z-z-zyje!”

Przełożył Bohdan Zadura



POSTĘP W LITERATURZE

ПРАГРЭС У ЛІТАРАТУРЫ



АРФЭЙ, ЭЎРЫДЫКА, ГЕРПЭС

„Зорка Вэнэра ўзышла...”
Не, гэта не пачатак рамансу,
і нават ня чорная мша.
Гэта пазыўныя ў менскім мэтро.
„Паважаныя пасажыры,
не падыходзьце да краю плятформы!
Не заходзьце за абмежавальную лінію!
І не азірайцеся,
напрамілы Бог, не азірайцеся!..”
Але ён такі азірнуўся.

Некалі ён іграў на скрыпцы
у падземным пераходзе,
і граў так,
што з усіх бакоў зьбіраліся
бяздомныя коткі й скінхэды,
і першыя кладліся ля другіх,
зачараваныя музыкаю.

Калі ён запільваў
„Dance me to your beauty with a burning violin”,
спыняліся ўсе навакольныя сабакі –
нямецкая аўчарка
і трое ейных спадарожнікаў ва ўніформе.
А аднойчы спынілася яна,
каб дакрануцца вуснамі да вуснаў
і адразу ж зьнікнуць у мэтро.

„Сука!” –
казаў ён назаўтра,
абмацваючы герпэс
і, зрэшты, зусім не жадаючы
пакрыўдзіць аўчарку ды іншых...

Потым былі ўцёкі й спробы схавацца
між пральняй і станцыяй „Інстытут культуры”.
На трэйцяя содні хаваньня ў мэтро
ён зноўку пабачыў яе.

ORFEUSZ, EURYDYKA I OPRYSZCZKA

„Gwiazda Wenus wzeszła na niebie…”
Nie, to nie początek romansu
ani nawet nie czarna msza.
To sygnał w mińskim metrze.
„Szanowni pasażerowie,
nie zbliżajcie się do krawędzi peronu!
Nie przekraczajcie ograniczającej linii!”
I nie oglądajcie się,
na miłość boską, nie oglądajcie się!..”
Jednak mimo wszystko się obejrzał.

Kiedyś grał na skrzypcach
w przejściu podziemnym,
i grał tak,
że ze wszystkich stron się zbiegały
bezdomne koty i skinheadzi,
i pierwsze kładły się koło drugich
oczarowane muzyką.

Kiedy wypiłowywał
„Dance me to your beauty with a burning violin”,
zatrzymywały się wszystkie okoliczne psy –
niemiecki owczarek
i trzech jego satelitów w mundurach.
A pewnego razu zatrzymała się ona,
żeby dotknąć ustami ust
i natychmiast zniknąć w metrze.

„Suka!” –
mówił następnego dnia,
obmacując opryszczkę
i, nawiasem mówiąc, wcale nie pragnąc
obrazić owczarka i pozostałych…

Potem była ucieczka i próby ukrycia się
między pralnią a stacją „Instytut Kultury”.
Na trzecią dobę tej zabawy w chowanego w metrze
znów ją zobaczył.

Яна ўсьміхнулася, даючы зразумець,
што пойдзе за ім паўсюль,
і яны пайшлі: ён сьпераду, а яна за ім.
„Не азірайся,
напрамілы Бог, не азірайся!” –
падказваў унутраны голас
і ўсе супрацоўніцы менскага мэтрапалітэну.

Але ён такі азірнуўся і –
вядома ж, яна аслупянела,
зрабіўшыся калёнаю з выявай дзяўчыны.
(Цяпер яе лёгка знайсьці на станцыі мэтро
сярод іншых пэрсанажаў Якуба Коласа.)

„Мой родны кут, як ты мне...
Паважаныя пасажыры,
пры карыстаньні эскалятарам
не апускайце рэчаў
на прыступкі й парэнчы!
Пазьбягайце трапляньня душы
у шчыліны
між рухомымі й нерухомымі
часткамі эскалятару!..”

Тыя, хто чакаў
скрыпкі ў падземным пераходзе,
абламіліся – ён ня выйшаў.
Ён зьнік у нетрах, і
няма таго, што раньш...
І толькі надпіс „Плошча Незалежнасьці”
паўзьверх надпісу „Плошча Леніна”
даводзіць, што ён покуль яшчэ жывы.

Uśmiechnęła się, dając do zrozumienia,
że pójdzie za nim wszędzie,
i poszli: on przodem, ona za nim.
„Nie oglądaj się,
na miłość boską, nie oglądaj się!” –
podpowiadał mu głos wewnętrzny
i wszystkie pracownice mińskiego metra.

Lecz on mimo wszystko obejrzał się i –
ona, oczywiście, skamieniała,
zamieniła się w słup z wyobrażeniem dziewczyny.
(Teraz ją łatwo znaleźć na stacji metra
między innymi bohaterami Jakuba Kołasa).

„Kraju rodzinny… nie mam siły!
Szanowni pasażerowie,
przy korzystaniu z ruchomych schodów
nie stawiajcie rzeczy
na stopnie i poręcze!
Strzeżcie się upadku duszy
w szczeliny
między ruchomymi i nieruchomymi
częściami schodów!..”

A ci, którzy czekali
na skrzypka w przejściu podziemnym
zawiedli się – on nie wyszedł.
Znikł w otchłani, i
nie ma tego, co było wcześniej…
I tylko napis „Plac Niepodległości” zrobiony ręcznie
nad napisem „Plac Lenina”,
świadczy o tym, że jeszcze żyje.

Przełożył Bohdan Zadura

СТАРЫ ПАЭТ

Стары паэт
ня мае шкодных звычак,
бо ад сьпіртнога зранку бывала пякотка,
а ад цыгарэтаў жаўцелі зубы;
потым зубоў ня стала,
ды не мяняць жа звычак на схіле гадоў.
Што да наркотыкаў,
дык ён мог бы намякнуць на знаёмства зь імі
дзеля таннай папулярнасьці ў моладзі,
але хай моладзь сама
дбае пра танную папулярнасьць,

а стары паэт
шырока вядомы,
хоць і ў вузкіх колах,
затое настолькі шырока,
што юныя літаратары
пасьля паэтычных чытаньняў,
апынуўшыся ў прыбіральні
ля суседняга з мэтрам пісуара,
ад хваляваньня забываюць расшпіліць прарэх.
„Вось здорава! – думае паэт. –
Я б так ня змог!”

Бо стары паэт
прачытаў за жыцьцё
сорак восем кніжак,
дваццаць дзьве зь якіх былі ягоныя,
яшчэ да дваццаці дзьвюх ён напісаў перадмовы,
а першыя чатыры ён памятае смутна;
хоць мае на паліцы
дзьве з паловай тысячы томікаў сваіх калегаў,
усе, вядома ж, з аўтографамі,
каб, Божа барані, ня здаў у букіністычную кнігарню,
але ён часам такі здае.
У маладосьці зь яго кпілі за неадукаванасьць

STARY POETA

Stary poeta
nie nabrał złych przyzwyczajeń,
bo od alkoholu miał z rana zgagę,
a od papierosów żółkły zęby;
potem zębów zabrakło,
ale przecież nie zmienia się przyzwyczajeń u schyłku życia.
Jeśli chodzi o narkotyki,
to mógłby zrobić aluzję do ich używania,
żeby zdobyć tani poklask u młodzieży,
ale to raczej sama młodzież
niech dba o tani poklask,

a stary poeta
był szeroko znany
chociaż i w wąskich kręgach,
ale dostatecznie szeroko,
żeby młodzi adepci literatury
po wieczorach poetyckich,
znalazszy się w ubikacji
przy sąsiednim z mistrzem pisuarze,
zapominali ze wzruszenia rozpiąć rozporek.
„Bomba! – myślał poeta. –
Ja bym tak nie potrafił!”

Bo stary poeta
przeczytał w ciągu swego życia
czterdzieści osiem książek,
z których dwadzieścia dwie były jego własne,
do dwudziestu dwóch innych napisał przedmowy,
a cztery pozostałe zapamiętał niewyraźnie;
choć ma na półkach
dwa i pół tysiąca tomików od swoich kolegów,
wszystkie, rzecz jasna, z autografami,
aby, Boże broń, nie oddał ich do antykwariatu,
ale i tak czasem oddaje.
W młodości nabijano się z niego za brak wykształcenia

ды іранічна казалі: „Вучыцца, вучыцца й вучыцца!”,
а цяпер не, таму

што стары паэт
наведаў дзьве з паловай тысячы школаў,
каб кожная навучэнка,
апроч вечару страты нявіннасьці
ды выпускной вечарыны,
запомніла яшчэ і ягоную творчую вечарыну,
але ж ніводная не запомніла,
а калі якая й пазнае яго на вуліцы,
дык аказваецца
суседкаю па лесьвічнай пляцоўцы
альбо ўнучкаю.

Стары паэт
дагэтуль хвалюецца перад выступамі,
думаючы, ці будуць крычаць „брава!”
ды выклікаць „на біс”,
і таму чытае з падкрэсьленым выклікам,
нібы пытаючы: „Хто тут супраць мяне?
Вы за ці супраць?”
Але ўсё абыходзіцца,
і заля дружна крычыць:
„ЗА!” і „БІС!”.

i ironicznie pouczano: „Uczyć się, uczyć i jeszcze raz uczyć się!” –
ale teraz już nie, bo

stary poeta
odwiedził dwa i pół tysiąca szkół,
żeby każda abiturientka,
oprócz wieczoru straty niewinności
i balu maturalnego,
zapamiętała jeszcze i jego wieczór poetycki,
ale żadna nie zapamiętała,
a jeśli nawet któraś poznaje go na ulicy,
to okazuje się być
sąsiadką z klatki schodowej
albo wnuczką.

Stary poeta
do tej pory ma tremę przed wystąpieniami
myśląc, czy młodzież będzie mu krzyczeć „czadu!”
i wywoływać go na bis,
dlatego też deklamuje z podkreślonym wyzwaniem,
jakby pytając: „Kto ma coś przeciwko mnie?
Jesteście za czy przeciw?”
Ale wszystko idzie gładko
i sala solidarnie skanduje:
„Za” i „bis” i „czadu!” –
Zajebisty dziadu!

Przełożył Jan Maksymiuk

ПРАГРЭС У ЛІТАРАТУРЫ

А ўсё-ткі меў рацыю
францускі казачнік,
які кляўся й бажыўся,
што ёсьць прагрэс у літаратуры.

Сёньняшні Гамэр
ніяк не залежыць
ад перабояў электраэнэргіі,
цалкам можа кіраваць
новай Нацыянальнай бібліятэкай,
хоць у душы крыху зайздросьціць
Рансару й Бэтховэну:
найлепшыя творчыя вечарыны
ладзіліся ў ДК таварыства глухіх.

Сапфо
больш не балятуецца на пасаду
дзясятай музы,
бо адмовілася на карысьць кінематографа;
і хоць не спазнала шчасьлівага каханьня,
затое атрымала свой нобэль
за прапаганду паліткарэктнасьці,
апярэдзіўшы Вэрлена, Рэмбо і Жорж Санд.

Стары Анакрэёнт
даўно кінуў піць
і можа толькі мроіць пра дзяўчатак,
затое ўключаны ў праграму
ўсіх школ і ўнівэрсытэтаў Грэцыі.

Віён
на поўніцу адчуў
усемагутнасьць праваабаронцаў,
хоць у краіне так і не скасавалі
сьмяротнага пакараньня,
а нават калі скасуюць –
што зьменіць купка дысыдэнтаў
з транспарантамі „дзе Віён?”

POSTĘP W LITERATURZE

A jednak miał rację
francuski bajkopisarz,
który zaklinał się i przysięgał,
że w literaturze jest postęp.

Dzisiejszy Homer
w żaden sposób nie jest zależny
od zakłóceń energii elektrycznej,
w pełni może kierować
nową Biblioteką Narodową,
choć w duszy odrobinę zazdrości
Ronsardowi i Beethovenowi:
najlepsze wieczory autorskie
odbywały się w DK stowarzyszenia głuchych.

Safo
już nie pretenduje do stanowiska
dziesiątej muzy,
ponieważ zrzekła się go na rzecz kinematografu;
i chociaż nie poznała szczęśliwej miłości,
to dostała swojego Nobla
za propagowanie poprawności politycznej,
wyprzedziwszy Verlaine'a, Rimbauda i George Sand.

Starzec Anakreont
dawno rzucił picie
i o dziewczętach może tylko marzyć,
za to włączony jest do programu
wszystkich szkół i uniwersytetów Grecji.

Villon
w całej rozciągłości odczuł
wszechmoc obrońców prawa,
chociaż w kraju i tak nie zniesiono
kary śmierci,
a nawet jeśli ją zniosą –
cóż zmieni grupka dysydentów
z transparentami „gdzie jest Villon?”

Усімі адрынуты Гюго
на ўласным досьведзе зьведаў,
што выраз „мець гемарой”
мае ня толькі пераносны сэнс.
Затое цяпер ёсьць шоў-бізнэс
і можна пісаць словы на музыку.

Ганкур
вядзе жывы дзёньнік у інтэрнэце.
Пакутуе на падваеньне асобы.

Фолкнэр і Маркес
канкуруюць на рынку турпаслугаў,
прапануючы гарачыя туры
ў Ёкнапатафу і Маконда.

І толькі Катул
не адчуў асаблівых зьменаў:
як дзьве тысячы зь нечым год таму,
ён аплаквае вераб’я сваёй каханай.
Птушыны грып, знаеце...

Przez wszystkich wzgardzony Hugo
na własnej skórze się przekonał,
że wyrażenie „mieć hemoroidy”
posiada nie tylko przenośne znaczenie.
Za to teraz jest show-biznes
i można pisać słowa do muzyki.

Goncourt
prowadzi żywy dziennik w Internecie.
Cierpi na rozdwojenie jaźni.

Faulkner i Marquez
konkurują na rynku usług turystycznych,
oferując „gorące” wycieczki
do Yoknapatawpha i Makondo.

I tylko Katullus
nie odczuł szczególnych zmian:
jak dwa tysiące lat temu z okładem
opłakuje wróbla swojej ukochanej.
Ptasia grypa, wiedzą państwo…

Przełożył Bohdan Zadura

ВАГНЭР. ТЭТРАЛЁГІЯ *ФАЎСТ*

I. Пра-Фаўст

Ён век тапіў у ведзьміным нэктары,
як сьведчыць знакаміты фаліянт;
пяяў для Грэтхэн нават без гітары,
і сьпеў быў найчысьцейшы, як брыльянт.

Пасьля ў вар'ятні білі санітары
(няспраўджаны дагэтуль варыянт).
Агент „0,7", кароль усёй шклатары,
ягоны цёзка і фаміліянт.

Цяпер яго ня вабяць пагулянкі:
а мо шатэнкі й насамрэч шатанкі?
Не, досыць! Ён *адгарцаваў* сваё!

Як радца, мае ў Ваймары заробак,
чытае Аляксандра-бацьку, то бок
прыгоды д'Артаньяна й Рышэльё.

II. Бессань у ноч Вальпургіі

Праз горы й красавіцкі ночны холад
у месяц травень рушыш напрасткі.
У небе два сузор'і – Серп і Молат –
плывуць, прычым у розныя бакі.

Красуня на мятле й рагаты волат
мілуюцца й скавычуць, як ваўкі;
твой сябра Мэфістофэль (ён жа – Воланд).
Што за народ? Вядома ж, землякі,

што раз на год зьбіраюцца на Гарцы.
Кульнуць па чарцы ды зьядуць па скварцы –
і браму пекла разаб'юць ушчэнт.

WAGNER. TETRALOGIA *FAUST*

1. Pra-Faust

Na Alzheimera pijał wiedźm nektary,
jak świadczy słynny foliał; rzewne szanty
dla Małgorzatki nawet bez gitary
śpiewał jak z nut: no, cud, no, wprost brylanty.

Oberwał potem w żłobku, błazen stary
(zweryfikujmy również te warianty:
jak panzerfaust umniejszał wartość tary
w monopolowym, to jest bywał anty).

Dziś go nie nęcą tańce i hulanki:
a nuż to nie szatynki, lecz szatanki?
Dosyć tych harzów! Było – nie ma! Kwita!

Dziś, radca dworu, dzieło Aleksandra-
ojca narodu (które jest jak mantra)
o dziejach szarej eminencji czyta.

II. Bezsenność w Noc Walpurgi

Przez jodły na gór szczycie, lasy-bory,
mkniesz na majówkę o kwietniowym chłodzie.
Sierpa i Młota w niebie gwiazdozbiory
na boki rozbiegają się w niezgodzie.

Jędza z rogaczem wdaje się w amory,
Mefisto (vulgo Woland) w złej przygodzie
jest ci kompanem. A to co za stwory?
Jakże, to zdrowe siły w twym narodzie

na Łysej Górze wyprawiają harce.
Defiladowym krokiem w grząskie bagno
prosto do piekła iść czwórkami pragną:

І ўратаваны шараговец Каін,
як гаспадар ад Брокену да ўскраін,
паўсюдна зьдзейсьніць поўны гэпі-энд.

III. Гамункул

Каспара, Мэльхіёра й Бальтазара
ня будзе – я ня веру ў трох цароў.
З набыткамі вяртаюся з базару,
каб хлопец не застаўся без дароў.

Мне ж падарункам – зьдзейсьненая мара:
праз кропельніцу ўведзеная кроў
бруіцца ў жылах, ажыла пачвара,
ён нарадзіўся, Вагнэр! Будзь здароў,

чатырохкротны доктар і магістар,
загартаваны ведаю філістэр,
няўдзячны імітатар хараства,

ледзь не забіты сківіцай асьлінай!
Ты поначы над колбай пырскаў сьлінай –
і стаўся зоркай новага Раства!

Але памрэш, як жыў, – напаўрасьлінай.

IV. Галена

Ты ўзьнёс у ейны гонар не хаціну –
гатычны замак, велічную цьвердзь.
Схуднеўшы ад каханьня на трациіну
й цьвярозы розум страціўшы на чвэрць,

намаляваў уяўную карціну:
мілосны вір, пяшчотаў кругаверць.
Ды творац неадольную плаціну
яе каханкі, час, прастора й сьмерць.

z Kainem w czarce, skwarce i pogwarce
odnajdą pełnię siermiężnego raju
w umiłowanym, ukochanym kraju.

III. Homunculus

Kacpra, Melchiora ani Baltazara
nie będzie – jak nie było od początku.
Wracam z bazaru: wiara czy niewiara,
na Gwiazdkę coś należy się dzieciątku.

A dla mnie prezent – to ten stwór, sen-mara,
marzenie, co ziściło się w żyjątku:
wre krew z kroplówki, rodzi się poczwara,
brawo, Wagnerze! Brawo, ojcze wątku,

doktorze czterokrotny i magistrze,
zahartowany w tyglu sztuk filistrze,
imitatorze piękna! Niestrudzenie

sędziwe chyląc niby głąb łysiny,
prażyłeś w szkiełku kał z domieszką śliny –
a dziś jak gwiazda zwiastuj Narodzenie!

Umrzesz jak żyłeś – życiem półrośliny.

IV. Helena

Nie jakąś chatkę lichą, lecz zamczysko
gotyckie, twierdzę wzniosłeś jej wspaniałą.
Na wiór z miłości wyschłeś, biedaczysko,
i ćwierć rozumu ledwie ci zostało,

a wciąż miłosne wabi cię kolisko,
kołomąt pieszczot, urojone ciało.
Lecz pozostają tamą mimo wszystko
czas, przestrzeń, śmierć, wraz z erotyczną chwałą.


Ты прагнеш немагчымага, упарты,
зь нябыту клічаш валадарку Спарты,
царыцу старажытнагрэцкіх сноў.

Ды мара не скараецца нахабу:
над прывідам схіляесься – і зноў,
гаротны, узасмак цалуеш жабу.

Niepodobieństwa pragniesz więc, uparty,
z piekła władczynię wywołując Sparty,
w greckich rojeniach królującą babę.

Niewładne jednak nad marzeniem czary:
kiedy się chylisz nad wezgłowiem mary,
znów, nieboraku, ucałujesz żabę.

Przełożył Adam Pomorski



БАРМЭН-СЮІТА

На тытунёвай фабрыцы жанчыны
чатыры дні таму бяз дай прычыны
абвесьцілі агульны лакі-страйк,
і ў бары прыбыло слабога полу:
ціхманы апускае вочы долу,
затое для залётніка – клaндайк!

Наш бар – утульны, танны і спакойны:
сусьветныя пасканчваліся войны
і не сваволяць зброяй землякі.
А па-за тым, наш бар – на параплаве,
і лярвы, не забітыя ў аблаве,
бухаюць на сярэдзіне ракі.

Была адна, што больш за ўсіх бухала
й не апускала веек-апахала,
стыдаючыся позіркаў гасьцей.
Яна была па пашпарце цыганкай,
паводле звычак – нашай выхаванкай
і ўвагі нашай знакі найчасьцей

прымала канвэртабэльнай „капустай”,
ды яўнай не займалася распустай,
бо замужам была, хоць сужанец
часова кукаваў без суженіцы,
за кантрабанду седзячы ў вязьніцы:
злавілі на гарачым – і канец.

Фліртуючы з сумнеўнымі сябрамі,
яна чакала пры турэмнай браме,
пакуль яе прапусьціць вартаўнік,
што стаўся сьведкам ейнай прыгажосьці
і дзень пры дні чакаў красуню ў госьці –
і пачуцьця фатальнага ня ўнік.

Ён прагнуў, каб аднойчы, у Сэвілы,
ягоны сон яны ажыцьцявілі,

BARMAN – SUITA

W zakładach tytoniowych dziewczyny
ogłosiły bez żadnej przyczyny
cztery dni temu lucky strajk:
w naszym barze płeć słaba się tłoczy:
kto wstydliwy ten spuszcza w dół oczy,
dla podrywaczy zaś to – raj!

Bar nasz przytulny, tani, spokojny:
odeszły w przeszłość światowe wojny,
z bronią się już nie włóczy nikt.
I na statku bar nasz, więc pławią
się panny, które uszły obławom,
rozkosznie w rzece – wdzięk i szyk.

Taka jedna najbardziej szalała
i wachlarza swych rzęs nie spuszczała,
gdy patrzył na nią jakiś gość.
Wedle papierów była Cyganką,
zaś z obyczajów naszą krajanką
i powodzenie miała. Choć

kapusta zawsze była jej miła,
rozpustą jawną się nie trudniła,
bo miała męża, choć ten mąż
kukał sobie bez żony czasowo:
na przemycie złapany pechowo,
na wikcie więziennym był wciąż.

Z szemranymi flirtując kumplami,
wystawała u więziennej bramy,
nim wreszcie strażnik wpuścił ją.
On był świadom jej cudnej piękności
i codziennie zapraszał ją w gości
i w uczucie fatalne brnął.

Strasznie pragnął, by kiedyś w Sewilli
jego sen w rzeczywistość zmienili,

пабраўшыся ў мясцовага айца...
Ён не чытаў „Кармэн” – быў непісьменным.
А я на параплаве быў бармэнам
і бачыў гэту драму да канца.

Няшчасны вартаўнік паходзіў з баскаў
і зь недаверам ставіўся да баксаў,
і шлях, якім пайшоў ён, быў цяжкі:
ён дарыць краскі, краля – анігадкі,
ні гвазьдзікі ня ўражваюць, ні бра́ткі,
бо іншае дарылі ёй браткí.

Ён трызьніў у душэўным неспакоі,
начамі паўтараў імя, якое
мы блыталі то з кармай, то з кармой.
А здрадніца сядзела ў нашым бары
і, не знайшоўшы ніштаватай пары,
маркотна частавалася хурмой...

На параплаве музыка іграе,
канчаецца трагедыя старая:
прыбылы з Андалюзіі нацмен
у бар наш урываецца бяз маскі
і, крыючы па-мацеры па-баску,
страляе ў беспасажніцу Кармэн:

„Ну дык не даставайся ж ты нікому!”
Юрлівіца правальваецца ў кому,
а там адно цямрэча й цішыня...
А заўтрашні Высьпяньскі (ці Астроўскі)
нацешыцца й забудзе па-матроску,
як востраў (выспу) ўчорашняга дня.

ślub przed ołtarzem biorąc tam.
Analfabeta – nie czytał Carmen,
ja zaś stałem na statku za barem,
i wszystko to widziałem sam.

Nieszczęsny strażnik pochodził z Basków
i nieufnie podchodził do baksów,
więc trudny sobie wybrał szlak:
daje kwiaty, nie wzrusza ślicznotki,
co jej goździki, fiołki, stokrotki
od innych miała bratki wszak.

On w rozterce, miał myśli ponure,
i po nocach szeptał imię, które
myli się z karmą, z karą nam.
Wiarołomna siedziała zaś w barze
i stosownej nie znajdując pary
sok smutna piła sam na sam.

A na statku muzyka gra, zaraz
dobiegnie kresu tragedia stara.
Andaluzyjczyk wpada w szał,
i do baru bez maski się wdziera,
i po baskijsku klnąc jak cholera,
oddaje w biedną Carmen strzał:

„Nikt już ciebie nie będzie posiadał!"
Rozpustnica się w letarg zapada,
gdzie już cisza i mgła do dna.
Zaś jutrzejszy Wyspiański (Ostrowski)
się nacieszy, rzuci po matrosku
jak ostrów (wyspę) poprzedniego dnia.

Przełożył Bohdan Zadura

ПАСЬЛЯМОВА

Ты занураўся ў сене, нібы ў Сене,
з цыганскаю красуняю Кармэн,
ёй недарэчы дарачы насеньне
й нічога не жадаючы ўзамен.

Пара зьбіраць плады, цяжар асеньні
узважваць, ды марнее твой бязьмен.
А ты ўсё прагнеш боўтацца ў басэйне –
мяркуеш, што дагэтуль супэрмэн.

Ты б мог сягнуць вышэй за піраміды,
але ў кампутары Сэміраміды
твой сад завіс яшчэ ў палеаліт.

Гадуючы жыгучку і дзядоўнік,
чакаеш, покуль зьявіцца садоўнік,
які націсьне „ctrl”-„alt”-„delete”.

POSŁOWIE


Zanurzałeś się w sianie, jak w Sienie,
ze ślicznotką cygańską Carmen,
niedorzecznie tryskając nasieniem
i nic nie chcąc w zamian za swą karmę.

Czas owoce zbierać, plon jesieni
ważyć, lecz twa waga drży na marne,
a ty wciąż się chcesz kąpać w basenie,
jak supermen przygryzasz wciąż wargę.

Mógłbyś wzlecieć ponad piramidy,
lecz twój ogród się w Semiramidy
komputerze zawiesił jak mit.


Rozgarniając łopuchy i trawy,
czekasz, kiedy ogrodnik się zjawi,
żeby wcisnąć <ctrl> – <alt> – <delete>.

Przełożył Bohdan Zadura


AX

HIGIENA INTYMNA

ІНТЫМНАЯ ГІГІЕНА



* * *

невядомыя кветкі паўзуць на сьвятло з вазоніка
зеляніны ўсё болей – болей чым на даляры
безьбілетны *sputnik* зямлі пералётнае сонейка
робіць кола па небе і сядае на твае акуляры

матылёк на далоні як сэрца б’ецца бяз допінгу
па-пластунску ў атаку вусень паўзе па камлі
і вясна распранае зямлю да зялёнага топіка
і цікаўным відаць аголены пуп зямлі

* * *

kwiat nieznany na światło pełznie z wazonika
zieleni ciągle więcej lśni jak na dolarach
sputnik ziemi słoneczko na gapę pomyka
robi koła i siada na twych okularach

motyl na dłoni – serce co bije bez kopa
gąsienicy zwiadowcy atak po łodydze
wiosna rozbiera ziemię do zieleni topu
to ciekawe – golutki pępek świata widzę

Przełożył Leszek Engelking

СТО ПУДОЎ АДЗІНОТЫ

I just called to say I love you
Stevie Wonder

сто пудоў адзіноты больш чым пацягне ліфт
за акном то зьліва то пролівень то залева
ходзяць думкі налева і ўлева схіляюць шрыфт
і пішу пачынаючы з рыфмаў справа налева

сёньня дзень і ноч пагадзіліся на нічыю
і ніякай нябеснай манны максымум манка
а назаўтра вечар з раніцы зуб даю
гэта восень будзе вільготнай як німфаманка

гэта восень будзе вільготнаю сто пудоў
нібы горла не прасыхацьме да небакраю
але будзь я нават нэграм пахілых гадоў
я вазьму тэлефон і скажу што цябе кахаю

STO ŁAT SAMOTNOŚCI


I just called to say I love you
Stevie Wonder

sto łat samotności nażyłem a wciąż mi dziurawo
za oknem to plucha, to chlapa, to ulewa
myśli błądzą i mokną to w macondo to w macao
i wiersz się pisze od rymów z prawa do lewa

dziś dzień i noc skończyły dwubój remisowo
żadnej manny z nieba co najwyżej mannka
ale jutro wieczorem z rana daję słowo
ta jesień się nawilży znów jak nimfomanka

ta jesień będzie nudna jak cukinia w weku
i przymulona jak na poleskich bagnach wiocha
ale gdybym nawet był murzynem w starszym wieku
i tak wykręcę numer i powiem że cię kocham

Przełożył Jan Maksymiuk



* * *

ты ўмееш гадаць бяз кавы досьць цынамону й гвазьдзікі
арыентуесься ў музыцы і паралельных сусьветах
юная нібы яшчэ не запалены маладзік і
старая як вечнасьць таму пагашаны ў небе ветах

заўсёдніца ў кожным касьцёле сынагозе і кірсе
гатовая ехаць стопам а потым вяртацца па шпалах
а потым выйсьці на подыюм хістаючыся як на пірсе
такая лёгкая што здаецца змые любы фотаспалах

покуль мэтро развозіць па наваголнім аргане
покуль мяне развозіць – праўду мяшаў з маною
ты засынаеш у недасяжнай дзявочай фата-маргане
і прачынаесься ў ложку побач са мною


* * *

umiesz wróżyć bez kawy tylko cynamon i goździki
znasz się na muzyce i równoległych światach
jesteś młoda jak nowa ukryta w warkoczu bereniki
i stara jak po gwieździe wygasłej poświata

bywalczyni każdego kościoła cerkwi synagogi
chętna jechać stopem i wracać do domu pieszo
a potem wejść na podium ledwo czując nogi
tak lekka że można cię zdmuchnąć byle fleszem

gdy metro rozwozi ludzi po noworocznych organach
gdy mnie roznosi od bajerów jak w amoku
zasypiasz w niedosiężnych dziewczęcych fata-morganach
by obudzić się w łóżku tuż przy moim boku

Przełożył Jan Maksymiuk



* * *

лёс цалуе цябе ў шчаку ты яму падстаўляеш вусны
бо жывеш да нашае эры і ня лічыш нашых гадоў
твая мэтрыка даўні эпас дагамэраўскі дзёньнік вусны
белай пенаю раскіданы па сузор'і сямі гарадоў

ты ня бачыш павольных сноў і ня танчыш павольных танцаў
бо твая рытмічная памяць захавала выбух і ўсхліп
не хапае паветра ў лёгкіх ды ня хочаш лёгкіх дыстанцыяў
бо ня маеш часу і месца на паўторны відэакліп

алімпійскія гульні жарсьці на якіх за цябе заўзею
а вакол равуць стадыёны і прыемна што мы адны
засынаем да новай эры і прыходзяць дзіўныя сны
як жыцьцё што бачым з акна авангардавага музэю

* * *

los cię całuje w policzek a ty mu podstawiasz usta
nie nasze lata rachujesz nie naszą erę ci dano
metryka twa dawny epos twój dziennik opowieść ustna
po siedmiu miast gwiazdozbiorze rozlana bielutką pianą

nie śnisz powolnych snów ani nie tańczysz powolnych tańców
bo twoja rytmiczna pamięć i huk i pisk chowa skrzętnie
nie starcza powietrza w płucach lecz nie chcesz krótkich dystansów
bo nie masz miejsca ni czasu na replay w zwolnionym tempie

na namiętności igrzyskach dopingiem bój wspieram twardy
dokoła ryczą stadiony lecz my jesteśmy tu sami
uśniemy przed nasza erą porwani dziwnymi snami
dziwnymi jak widok z okna muzeum snów awangardy

Przełożył Leszek Engelking

ET SI TU N’EXISTAIS PAS…

калі б цябе не было ў вялікім сусьветным раскладзе
я выдумаў бы што ты далёкі касьмічны спалах
сьвятлом бы табе дасылаў эсэмэскі ўва ўмоўным ладзе
і дарогу б чытаў па тваіх зорных ініцыялах

я наносіў бы тваё ймя на зямныя й нябесныя мапы
прамаўляў бы яго на ўдыху захлынаючыся ад шаленства
і ня верыў што нават малпа можа паходзіць ад малпы
бо ўсё выглядала б створаным на божае падабенства

я складаў пра цябе й гарлаў бы невядомыя іншым песьні
і суседзі прачнуўшыся ўночы ня зналі б каго я клічу
я глыбока сярод зімы пасылаў бы іх... на прадвесьне
і ўпершыню ў жыцьці не баяўся б таннага кічу

калі б цябе не было выдумляў бы цябе як твор я
і павольна канаў ад шчасьця ня просячы эўтаназіі
мой аловак бы лётаў па-над зямлёй як указка прагнозу надвор’я
але ты ў мяне ёсьць і ня ведаю што рабіць са сваёй фантазіяй

ET SI TU N'EXISTAIS PAS...

gdybyś nie istniała w ogromnym systemie wszechświatowym
wyobraziłbym cię jako daleki kosmiczny wybuch
słałbym ci świetlne esemesy w trybie warunkowym
i czytałbym drogę z inicjałów wśród gwiezdnego pyłu

nanosiłbym twe imię na ziemskie i gwiazdowe mapy
wymawiałbym go na wdechu do szaleństwa
nie wierzyłbym że i małpa może pochodzić od małpy
bo we wszystkim widziałbym boskie podobieństwo

układałbym o tobie i śpiewał wrzaskliwe piosenki
i sąsiedzi w nocy klęliby mnie że o rety
a ja bym ich miał głęboko w... poważaniu kochanieńkich
i po raz pierwszy w życiu nie bałbym się tandety

gdybyś nie istniała wymyślałbym cię jak wiersz
od szczęścia konałbym powoli nie prosząc o eutanazję
mój ołówek latałby ponad kartką jak świerszcz
ale ty istniejesz i nie ma miejsca dla mojej fantazji

Przełożył Jan Maksymiuk

ЛЮБОЎНАЯ ВАЙНА

Як ножкі цыркуля...

Джон Дон

Крэсьлім новыя межы,
пажыраем чужыя тэрыторыі.

І я ўжо захапіў
палову сушы,
і ты ўжо захапіла
палову сушы.

А няўмелыя рукі
ўсё не навучацца трымаць
сваёй зброі.

Як ножкі двух цыркуляў,
пераплятаюцца твае і мае
драўляныя палачкі.

MIŁOSNA WOJNA

...tak jak ramiona
Cyrkla podwójne...

John Donne, tłum. Stanisław Barańczak

Kreślimy nowe granice,
pożeramy nowe terytoria.

I ja już chwyciłem
połowę sushi,
i ty już chwyciłaś
połowę sushi.

A niezgrabne ręce
w żaden sposób się nie nauczą
trzymać swej broni.

Jak ramiona dwóch cyrkli
przeplatają się moje i twoje
drewniane pałeczki.

Przełożył Bohdan Zadura

ІНТЫМНАЯ ГІГІЕНА

Беручы гарачую ванну
з новым акрылавым пакрыцьцём,
бярэш заадно
і нешта да чытаньня.

Сёньня ты ўважліва чытаеш
надпіс на плястыкавым цюбіку –
крэм душ для інтымнай гігіены,
з намаляванай Афрадытай,
маса нэта 210 гр.

„Нанясеце на мачалку
альбо ўсьпеньце паміж далонямі
і нанясеце на скуру".

Можа, з гэтай пены, – думаеш ты, –
нехта й народзіцца.
Стоп, а крэм душ – гэта што?
І чаму тады наносіць на цела?

Маўчыць намаляваная Афрадыта.
Новае акрылавае пакрыцьцё
таксама нічога не тлумачыць,
быццам бы дае зразумець,
што няма чаго выпендрывацца,
што твая задача – проста зрабіць выбар:
на мачалку ці паміж далонямі.

Але, пагрузіўшыся ў ванну
па самую эўрыку,
ты разумееш сваю бездапаможнасьць,
адчайна лыпаеш павекамі,
а літары ўсё адно размываюцца,
покуль ты расьціраеш па твары
салёную субстанцыю
для інтымнай гігіены
душ.

HIGIENA INTYMNA

Biorąc gorącą kąpiel
w nowej akrylowej wannie,
równocześnie bierzesz
coś do poczytania.

Dziś czytasz uważnie
napis na plastykowej tubce –
crème douche do higieny intymnej,
z narysowaną Afrodytą,
masa netto 210 g.

„Nanieś na gąbkę
lub spień w dłoniach
i nanieś na skórę".

Może z tej piany – myślisz –
ktoś się narodził.
Zaraz, a crème douche to co?
I dlaczego wtedy nanosić go na ciało?

Milczy narysowana Afrodyta.
Nowa akrylowa powierzchnia
też niczego nie wyjaśnia,
jakby dawała do zrozumienia,
że nie ma co się wysilać,
że twoje zadanie – to po prostu dokonać wyboru:
na gąbkę albo między dłonie.

Jednak zanurzywszy się w wodzie
po samą eurekę,
pojmujesz swoją bezradność,
rozpaczliwie mrugasz powiekami,
a litery mimo wszystko się rozmywają,
kiedy rozcierasz na twarzy
słoną substancję
do intymnej higieny
dusz.

Przełożył Bohdan Zadura

* * *

дзень ад сонца і траваў цяжкі й павохны
запамарока вось-вось расхістае зямную вось
зьлева і справа расчыненыя ўсе вокны
птушка магла б твой вагон праляцець наскрозь

церазь цябе хвіліны плывуць чаргою
паразуменьне са сьветам такое што проста жах
бо прыгажуня насупраць дрыгае доўгай нагою
у такт мэлёдыі што гучыць у цябе ў вушах

нават паверыў – жыцьцё нам яшчэ пасьпявае
дзён і начэй да халеры і шчасьце на нашым баку
ножка красуні за музыкай не пасьпявае
мажны бойфрэнд на калена паклаў руку


* * *

dzień dziś ciężki i wonny od słońca i trawy
zawrót głowy rozchwieje zaraz ziemską oś
wszystkie okna otwarte i z lewej i z prawej
ptak mógłby cały wagon przelecieć na wskroś

szereg minut przez ciebie spokojnie przepływa
rozumiesz się ze światem na sto dwa lub trzy
bo ślicznotka naprzeciw długą nogą kiwa
w takt melodii co w uszach ci taktownie brzmi

wierzysz nawet że życie naśpiewa nam słodkich
dni i nocy bez liku zły los złożył broń
nie nadąża za taktem zgrabna nóżka ślicznotki
tłusty gość na kolanie położył jej dłoń

Przełożył Leszek Engelking


ARCHE

ZMIENIAJĄC KANAŁY. PODRÓŻE SENTYMENTALNE

ПЕРАКЛЮЧАЮЧЫ КАНАЛЫ. СЭНТЫМЭНТАЛЬНЫЯ ПАДАРОЖЖЫ



ЧЭМПІЯНАТ ЭЎРОПЫ

З кім толькі
ні параўноўвалі Эўропу,
дзяўчынку-каўбоя,
што ўседзела на бычынай сьпіне
максымальна доўга,
аж да самага канца радэа.

Я неяк назваў яе пясочніцаю,
куды не пускаюць беларускіх дзетак
іх нацыянальна непрасунутыя бацькі.
Сёй-той абразіўся параўнаньнем,
хоць, мяркую,
каўбоям і матадорам спадабалася б.

Але я тады думаў
не пра пясочную арэну
палітычнай карыды,
а пра досыць нявінныя дзіцячыя забавы
з саўком
(я пра маленькую рыдлёўку),
плястмасавым самазвалам
ды алавянымі жаўнерыкамі,
калі кожны з нас быў генэралам,
які толькі пачынаў сваю
пяшчаную кар’еру.

Што да дзяўчатак, то яны
пераважна рабілі „сакрэты”,
выкопваючы ў пяску ямінкі
і аздабляючы гэтыя дамавінкі
жывымі кветкамі
і (нежывымі) паперкамі ад цукерак і жуек.
Галоўнай часткаю інсталяцыі
быў каляровы кавалачак шкла,
што клаўся паўзьверх –
і атрымлівалася *красиво*;
потым „сакрэт” закопваўся,

MISTRZOSTWA EUROPY

Do kogóż to
nie porównywano Europy,
małej kowbojki,
która utrzymała się na byku
rekordowo długo,
aż do samego końca rodeo.


Kiedyś nazwałem ją piaskownicą,
do której nie wpuszczają białoruskich dzieci
ich narodowo niedopracowani rodzice.
Kogoś uraziło porównanie,
choć, jak sądzę,
kowbojom i matadorom mogłoby się spodobać.

Wtedy jednak myślałem
nie o piaszczystej arenie
politycznej korridy,
ale o niewinnych dziecięcych zabawach
plastikową wywrotką,
babkami z piasku
(zamkami z piasku?),
ołowianymi żołnierzykami,
lub nakręcanymi czołgami,
kiedy każdy z nas był dowódcą,
który dopiero zaczynał
znaczyć swoje 102.

A jeśli chodzi o dziewczynki, to one
przeważnie skrywały „sekrety”,
wykopując w piasku dołeczki
i ozdabiając takie mogiłki
żywymi kwiatkami
i (nieżywymi) papierkami po cukierkach i gumach.
Główną częścią instalacji
był kolorowy kawałeczek szkła,
kładziony na sam wierzch –
wychodziło to wzorowo;

старанна хаваўся, але так,
каб лёгка было знайсьці,
асабліва іншым.

Толькі праз шмат гадоў я зразумеў,
што гэта былі правобразы
нашых будучых інтэрнэт-сайтаў,
вершаў і порназдымкаў,
што мятлікамі ляцяць на сьвятло
і заблытваюцца ў сусьветнай павуціне,
у душ*ы* прагнучы
зьвярнуць на сябе хоць якую ўвагу,
ды ўпарта хаваючы
свае сумнеўныя „сакрэты”,
нібы тая Эўропа,
чэмпіёнка радэа,
старая панна,
што так і ня зьлезла з бычынае сьпіны
для чаго іншага.



potem zakopywało się „sekret”,
starannie skrywając, ale tak,
by łatwo go było odnaleźć,
szczególnie innym.

Dopiero po wielu latach zrozumiałem,
że to były pierwowzory
naszych przyszłych stron internetowych,
wierszy i zdjęć porno,
które jak ćmy lgną do światła
i zaplątują się w światową pajęczynę,
w głębi duszy pragnąc,
by ktoś zwrócił na nią choć cień uwagi
i uparcie skrywając
swoje wątpliwe „sekrety”,
niby ta Europa,
mistrzyni rodeo,
stara panna,
która wciąż trzyma się byka
i nie zna innego.

Przełożyła Katarzyna Bortnowska

ДРАЙВ

Тут магла быць халяўная рыфма „кайф”,
але наш *драйвэр* гаворыць прозаю.
Я разумею прыкладна трэйцюю частку,
таму застаецца радыё.

У бэрлінскім FM-е цесна:
дваццаць чатыры гадзіны джазу
і дваццаць чатыры – клясыкі.

Моцарт добра адпавядае
рухам нашага кіроўцы.
Усё віртуозна
і па-нямецку дакладна,
нібы спэцыяльна прыдумана
для вялікага слаламу ў дарожным корку:
трапіў –
цяпер адкаркоўвай,
і ён адкаркоўвае
ў рэ міноры,
мажор!

Зусім іншае джаз.
Цябе ахоплівае паніка.
Табе здаецца, што Оскар Пітэрсан
грае апошні раз у жыцьці.
Прынамсі, тваім.
Бо кіроўца,
зачараваны чарговаю сынкопай,
вось-вось ня ўпішацца ў паварот,
і тады пачнецца сапраўдны джаз,
музыка для тоўстых рэаніматараў,
якія доўга ня змогуць сьцяміць,
што здарылася:
ці то дзьверцу заклініла,
ці то цябе заклініла,

DRIVE

Do tego możnaby dać fajansiarski rym live,
ale nasz driver mówi prozą.
Rozumiem mniej więcej jedną trzecią,
zatem pozostaje radio.

W berlińskim FM-ie tłok:
dwadzieścia cztery godziny jazzu
i dwadzieścia cztery godziny klasyki.


Mozart pasuje znakomicie
do ruchów naszego kierowcy.
Wszystko odbywa się z wirtuozerią
i niemiecką dokładnością,
jakby było przeznaczone specjalnie
do slalomu-gigantu w miejskim korku:
zakorkowałeś się –
to się odkorkuj,
i kierowca się odkorkowuje
w d-molu,
dur!

Co innego jazz.
Ogarnia cię panika.
Zdaje ci się, że Oscar Peterson
gra po raz ostatni w życiu.
Przynajmniej w twoim.
Bo kierowca
zafascynowany kolejną synkopą
zaraz nie wyrobi się na zakręcie
i wtedy zacznie się prawdziwy jazz,
muzyka dla grubych reanimatorów
nie będących przez dłuższy czas w stanie zrozumieć,
co się stało:
czy to zablokowały się drzwi,
czy to ciebie zablokowało,

ці ўва ўсім вінаваты драйвэр,
каторы
у аўтамабільным заторы
дачакаўся свайго саторы.

czy za to wszystko odpowiada driver,
który przed skasowaniem gabloty
zaliczył dwa muzyczne odloty
i być może już nie wróci do roboty.

Przełożył Jan Maksymiuk



ПРАГНОЗ НАДВОР'Я

Едучы ў гатэльным ліфце,
дазнаесься шмат цікавага.
Не, не пра тое, ці шмат паверхаў,
гледзячы на кнопкі;
і не пра ўласнае сьвінства,
гледзячы ў люстэрка;
і нават не пра ход чэмпіянату Эўропы па футболе,
што фіксуецца ў адмысловай табліцы.

Гатэльны ліфт насамрэч –
маленькі філіял бэрлінскай абсэрваторыі,
і кожнага ранку
ты чытаеш апошнія зводкі
зь нямецкага атмасфэрнага фронту,
каб выйсьці ў горад
і на ўласнай скуры пераканацца,
што прагнозы – рэч няўдзячная,
а мокрая кашуля – бліжэй да цела.

Штось ня так,
штось ня так з гэтым небам,
ад якога не ратуюць
ні хованкі ў найбліжэйшай краме,
ні парасон, прынагодна куплены
ў гэтай краме,
ні алькаголь, прынагодна куплены
на радзіме.

Вядома ж, можна цэлы дзень
праседзець у гатэлі,
але й адтуль адкрываецца відаль
на бэрлінскае неба
зь яго перыстымі аблокамі,
кучавымі хмарамі
і пералётнымі анёламі
„Люфтганзы”.

PROGNOZA POGODY


Jadąc w hotelowej windzie
dowiadujesz się o wielu ciekawych rzeczach.
Nie, nie o tym, ile mają pięter
z liczenia przycisków;
i nie o własnym drańswie,
z patrzenia w lustro;
i nawet nie o mistrzowstwach Europy w piłce nożnej
zrelacjonowanych na specjalnej planszy.

Hotelowa winda jest tak naprawdę
filią obserwatorium berlińskiego,
gdzie każdego rana
można przeczytać ostatnie komunikaty
z niemieckiego frontu atmosferycznego,
przed wyjściem do miasta
i przekonaniem się na własnej skórze,
że prognozy są rzeczą niewdzięczną,
a mokra koszula bliższa jest własnemu ciału.

Coś nie tak,
coś jest nie tak z tym niebem,
przed którym nie ratuje
ani schronienie się w najbliższym sklepie,
ani parasol kupiony przygodnie
w tym sklepie,
ani alkohol kupiony przygodnie
w ojczyźnie.

Oczywiście można cały dzień
przesiedzieć w hotelu,
ale i stamtąd rozpościera się widok
na berlińskie niebo
z pierzastymi obłokami,
kędzierzawymi chmurami
i przelotnymi aniołami
Lufthansy.

І нават схаваўшыся
у Музэі кіно на Патсдамскім пляцы,
ты маеш усе шанцы
пабачыць найлепшыя кавалкі
неба над Бэрлінам.



Nawet chroniąc się
w Muzeum Kina na Placu Poczdamskim
masz wszelkie szanse
obejrzeć najlepsze kawałki
nieba nad Berlinem.

Przełożył Jan Maksymiuk

ПЕРАКЛЮЧАЮЧЫ КАНАЛЫ

Каналаў у Амстэрдаме
нашмат болей,
чым на тэлебачаньні.

Ні па адным з апошніх,
што вельмі дзіўна,
не ідзе порна;
па адным зь першых,
што яшчэ дзіўней,
ідзе ваш карабель інтэлектуалаў.
(Відаць, прыказка памыляецца,
і шанцуе ня толькі дурням.)

Вы, мабыць, тут адзіныя,
хто ня езьдзіць на роварах,
якіх навокал столькі,
што, здаецца, у горадзе
спынілася вэлягонка.
Вось толькі жоўтая майка лідэра
крыху памільгала й згубілася
у вечаровым сьвятле
чырвоных ліхтароў.

Толькі тут ты нарэшце паверыў
у пачэсны абавязак
сеяць разумнае, добрае, вечнае,
і таму ідзеш у кафэшоп,
каб абсалютна легальна
набыць для сяброў-музыкаў
канапляных зярнятак.

Нехта выдумаў
сумяшчаць гэтыя кафэшопы
з інтэрнэт-кавярнямі,
нібы наўмысна,
каб ты болей ніколі не казаў сабе,
пазнаўшы знаёмага

ZMIENIAJĄC KANAŁY

Kanałów w Amsterdamie
jest o wiele więcej
niż w telewizji.

Na żadnym z tych drugich,
co jest bardzo dziwne,
nie idzie porno;
po jednym z tych pierwszych,
co jest jeszcze dziwniejsze,
sunie nasz statek intelektualistów.
(Wbrew istniejącemu mniemaniu
statki nie wożą wyłącznie głupców.)

Jesteśmy tu chyba jedynymi
przemieszczającymi się nie na rowerach,
których dokoła jest tyle,
jak gdyby w mieście
właśnie skończył się etap wyścigu kolarskiego.
Żółta koszulka lidera
mignęła przez moment i zniknęła
w wieczornym świetle
czerwonych latarni.

Dopiero tutaj uwierzyłeś ostatecznie
w zaszczytną misję
siania rzeczy rozumnych, dobrych i wiecznych,
dlatego wchodzisz do cafe-shop'u
żeby całkiem legalnie
nabyć dla zaprzyjaźnionych muzyków
ziarna konopi.

Ktoś wpadł na pomysł
połączyć te cafe shop'y
z kawiarniami internetowymi,
jakby specjalnie,
żebyś się nie wkurzał
trafiwszy na znajomego

мярзотніка ў сеціве,
што гэтая сволач вярзе на форуме?
Ён што – абкурыўся?

Гандлёвец шчасьцем
не спыняецца на дасягнутым
і спрабуе ўпіхнуць табе
грам, а тое і ўсе тры
экалягічна чыстай радасьці,
і ты пагаджаесься,
і крыху пазьней разумееш,
як усё-ткі меў рацыю
наш клясык, напісаўшы:
„плылі сузор'і касякамі ў небе".

І, як некалі маці
рабіла зарубкі,
вымяраючы твой рост,
ты таксама робіш пазногцем
пазнакі на касяку,
рэгіструючы рост
новых адчуваньняў.

Ты гатовы адчуць
нават водар дажджу
у суседняй краіне,
толькі ўва ўсёй Эўропе суха,
і табе застаецца рэагаваць
на каву,
жаночы парфюм
і кветкі.

Прадаўцы туліпанаў
сустракаюцца тут значна часьцей
за пакупнікоў,
але ты наіўна верыш,
што, нягледзячы на свабоднае каханьне,
масты каналаў тут
разводзяцца значна часьцей,
чым людзі.

gnojka w sieci,
co też ta swołocz bredzi na czacie?
Naćpał się czy co?

Handlarz szczęśliwością
nie poprzestaje na osiągniętym
i próbuje wepchnąć ci
gram albo i całe trzy
ekologicznie czystej błogości;
zgadzasz się
i trochę później rozumiesz,
jak bardzo miał rację
nasz klasyk pisząc
„kręcę gwiazdy swoim duchem”.

I jak niegdyś babcia
skręcała skrzętnie główki kapusty
na naszej działce,
żeby zapełnić domową spiżarnię,
tak ty teraz skręcasz coraz to nowe działki,
żeby jak najskrzętniej opróżnić
swój kapuściany łeb.

Wreszcie jesteś gotów poczuć
nawet zapach deszczu
w sąsiednim kraju,
ale w całej Europie posucha,
więc pozostaje ci bukiet
z kwiatów,
kawy
i damskich perfum.

Sprzedawcy tulipanów
trafiają się tu znacznie częściej
niż kupujący,
a ty naiwnie wierzysz,
że wbrew powszechnej wolnej miłości
zwodzonych mostów jest tu o wiele więcej
niż rozwodzonych małżeństw.

Przełożył Jan Maksymiuk

* * *


...і чуеш, як родны памежнік
кажа мне: „Здравствуйте!„

У. Арлоў

Між Летувой і РБ – тэрыторыя нічыя.
Колы змаўкаюць. Мытнікі абходзяць вагоны.
Зараз будуць глядзець у пашпарт, бы там – ня я,
а каляровы здымак Мэдузы Гаргоны...

Толькі раптоўна:
„Спадар Хадановіч? Андрэю!„
Слухаю – і дурэю.

Нібы з марозу добра заліў за каршэнь,
я адчуваю радасьці поўную аблачыну
у штанах, куды за пашпартам лезу ў кішэнь,
зачараваны ілюзіяй, што вярнуўся ў сваю айчыну.



* * *

...i słyszysz, jak ojczysty pogranicznik
mówi ci: „Zdrastwujtie!”

U. Arłou

Między Litwą i RB leży ziemia niczyja.
Koła milkną. Celnicy obchodzą wagony.
Zaraz wlepią oczy w paszport, jakbym tam nie ja,
a kolorowe zdjęcie Meduzy Gorgony.

A tu nagle:
„Spadar Chadanowicz? Andreju!”
Słucham i baranieję.

Jak gdybym prosto z mrozu walnął ze trzy sety,
tak mnie wzięło od tej białoruszczyzny –
taję w błogim cieple od skalpu po skarpety,
zawiany ułudą, że wróciłem do ojczyzny.

Przełożył Jan Maksymiuk

ПАЛЕСКІ ЦЫРУЛЬНІК

В. А.

Сонца яму на скуры малюе зоркі і свастыкі,
а ён, паслаўшы апёкі да самай яснай халеры,
паказвае найвышэйшую клясу мастацкай гімнастыкі,
калі размотвае стужкай рулён туалетнай паперы.

Плыве за вадою й зрабіўся крыху цырульнікам,
бо неабачлівым рыбкам галовы стрыжэ да шыек,
хвасты падстрыгае русалкам, палескі унікум,
ператвараючы іх у спартсмэнак-паралімпіек.

Воўну з аблокаў стрыжэ і сплаўляе паверхняй ракі,
а рэштки ўначы сабе цягне ў намёт пад голаў;
смак хлеба, якім ён корміць мясцовых дзяўчат з рукі,
аддае сродкам ад камароў – зрынутых зь неба анёлаў.

Ён ведае, дзе бярозкі растуць скрозь старыя пні,
нібы на голае цела мераюць фенечкі і маністы.
Калі ён заходзіць мыцца ў раку, у мыльнай пене сьляпні
канаюць, быццам замерзлыя ў горных сьнягох альпіністы.

Гарэлку ператварае ўначы ў навальнічны сок,
які цячэ лістотаю дуба ў жывым электрычным праменьні,
і кроплі здаюцца сухімі, як жоўты палескі пясок,
быццам сябры й сяброўкі кінулі зь неба па жмені.

CYRULIK POLESKI

W. A.

Słońce na skórze kreśli mu sto gwiazd i swastyk,
a on oparzeliny śle do przejasnej cholery,
i niby artystyczny wspaniały gimnastyk
w toaletowe wstęgi rozwija papiery.

Płynie z prądem i jest w nim już wiele z cyrulika,
bo nieostrożnym rybkom tnie głowy po szyjki,
ogony tnie rusałkom, poleski unikat
zmienia je tak w sportsmenki-paraolimpijki.

Wełnę obłoków strzyże, spławia rzeką, tylko
na resztkach kładzie głowę ciążącą jak ołów;
chleb, który z ręki daje dziewczętom-tubylkom
trąci „Katem komarów", strąconych aniołów.

On wie, gdzie młode brzózki rosną poprzez pniaki
jakby na gołe ciało mierzyły korale,
gdy idzie myć się w rzece, w mydlinach ślepaki
giną jak alpiniści wśród śniegów na skale.

Wódkę nocą przemienia w nektar nawałnicy,
co spływa liśćmi dębu w elektrycznych błyskach,
krople zdają się suche, to piach z okolicy,
który z nieba garściami krąg przyjaciół ciska.

Przełożył Leszek Engelking

НА ДАРОЗЕ

па пояс у джынсах брыдзеш супраць плыні шашы
твае непужаныя думкі як іншаходцы ў прэрыі
і стэрэа-скавышы як госьці на сьвяце душы
новаю аранжыроўкай гудуць у плэеры

аблокі ўгары няспынныя як аўто
між пятым і трыццаць пятым агораным кілямэтрам
ня спыніш нікога й цябе ня спыніць ніхто
і першы сустрэчны акажацца проста ветрам

будуеш з*а*мкі з паветра і першы блін
выходзіць нечым сярэднім між бібліятэкай і вежай
на гэтым сьвеце так многа кніг і цаглін
а ты з усіх акадэмій ня скончыў нават мядзьведжай

і можна згубіцца ў трох дарожных слупох
і ў думках так ціха – чуваць як робіцца муха
сланом і ты так доўга ў дарозе што Бог
здаецца сузор’ем Вялікага Віні-Пуха

W DRODZE


gdy po pas w dżinsach człowiek pod prąd szosy ruszy
jego odważne myśli suną wdzięcznym inochodem
i przeciągi stereo – goście bibki duszy
głośno grają w plejerze w aranżacji modnej

chmury jak samochody wciąż pędzą swą drogą
od piątego trzydzieści kilosów niełatwe
nikt ciebie nie zatrzyma ani ty nikogo
a pierwszy napotkany okaże się wiatrem

stawiasz zamki z powietrza pierwszy ich zalążek
trąci książnicą wieżą też od niego jedzie
na świecie tyle cegieł jest i tyle książek
z akademiiś nie skończył nawet tej niedźwiedziej


droga o drogę pyta i kpi z drogi droga
w myślach cisza ogromna i mucha-wariatka
zmienia się w słonia w górze zmęczony nie Boga
widzisz ale gwiazdozbiór Kubusia Puchatka

Przełożył Leszek Engelking


ЧКЛ.

ŚWIĘTA NOWEGO ROCKU

КАЛЯДНЫ РЭП



ДАЧАКАЦЬ!

Чаканьне каштоўнейшае за чаканку
старых мэдалёў, старажытных манэт.
Чакаць ганарару, навінаў, каханку,
што ўночы наведае праз „інтэрнэт”;

чакаць, што знаёмыя вернуць пазыкі,
і клясьціся больш не даваць напавер;
чакаць, што паўстане народ безьязыкі,
калі пасьля дожджыку будзе чацьвер;
чакаць, і пад томам „Сымона-музыкі”
у пыльнай шуфлядзе трымаць рэвальвэр.

Чакаць, калі здарыцца Раз Назаўсёды,
з надзеяю гледзячы за далягляд.
І вось дачакацца, калі не свабоды,
дык першых у новай эпосе калядь.

У міры ды згодзе, ізь сьмехам дый годзе,
на стол пачастункі паставіць свае
і ў першага-лепшага тысячагодзьдзя
спытаць: „Трэйцім будзеш?”
А раптам ня п’е?!

Усе атрымалі сьвяточныя грошы,
засмажылі тлустую смачную гусь
і жджэм, што апоўначы самы харошы
з экрана прамовіць „Жыве Беларусь!”

А мы ап’янеем, губляючы розум.
Закружыцца голаў ад мрояў і кроз.
Міколка, што некалі быў Паравозам,
а сёньня ўвіхаецца як Дзед Мароз,

ізноў распачне навагоднія жарты,
сьнягуркі апрануць свае кімано
і сядзе дасьведчаны шулер за карты –
гуляць із стагодзьдзямі ў „дваццаць адно”...

DOCZEKAĆ SIĘ!

Czekanie droższe jest od złota w banku,
od rzadkich monet w patynie i śniedzi.
Czekać na gażę, wieści, na kochankę,
co przez Internet nocą cię odwiedzi;

czekać aż odda dług znajomych paru
i przyrzec sobie nie pożyczać znowu,
czekać, aż wstanie z kolan niemy naród,
na wierzbie gruszki wyrosną, pod głową
w łóżku miast książki Kołasa trzymając
spluwę na wszelki wypadek gotową.

Czekać, że przyjdzie Raz na Zawsze wreszcie,
i się doczekać w końcu na spełnienie:
jak nie na wolność, to chociaż na pierwsze
w nowej epoce Boże Narodzenie.

W spokoju, w zgodzie, że koń rży w najlepsze,
na stół postawić wszystko, co dom kryje,
spytać spotkane tysiąclecie pierwsze:
„Czy będziesz trzecim?"
Lecz ono nie pije?!

Na święta wszyscy dostali pieniądze,
gęś tłusta smacznie pachnie w każdym domu,
czekamy, aż nam o północy nasz bonza
powie z ekranu: „Niech żyje Białoruś!"

I damy w szyję, rwąc rozsądku wodze.
W głowie zaszumi od marzeń i gróz.
I Mikołajek, co kolei wodzem
był, a dziś działa jako Dziadek Mróz,

znów zacznie swoje noworoczne żarty
pośród śnieżynek – gejsz nowego roku,
i stary szuler siądzie, żeby w karty
ze stuleciami teraz zagrać w oko…


А стрэлка праходзіць апошні адцінак.
(Два тысячагодзьдзі – на ейным баку!)
Зязюля падкінула яйка ў гадзіньнік
і хутка ўсясьветнае грымне „ку-ку”.

30 сьнежня 2000

Strzałka ostatni odcinek przebiega.
(Bak jeden – przestrzeń aż dwu tysiącleci!)
Kukułka jajko podrzuciła w zegar,
za chwilę głośne „ku-ku” w świat poleci.

30 grudnia 2000

Przełożył Bohdan Zadura



РАСТВО НА „РАСТВОРА-БЭТОННЫМ”

Раство на „Раствора-Бэтонным”.
Сьнежань за часам мясцовым.
Цяжка брысьці мадоннам
у зімным сьвятле месяцовым

ходзішчам незнаёмым
зь ліпамі паабапал.
Вось Каспар пакрыёма,
нібы кульгавы д’ябал,

вось Бальтазар з батонам,
вось Мэльхіёр зь бітонам –
на пацеху мадоннам
крочаць „Раствора-Бэтонным”.

Слота вечная наша,
звыклы голад і холад.
Вецер *made in Russia,*
вецер *made in Poland*.

Паўзе апошні тралейбус.
Наступны прыпынак „Раствора-
Бэтонны”. Падпіты бэйбус
глядзіць на мадоннаў сувора.

Дзеўкі – ведзьма на ведзьме –
бавяцца ў тамагочы.
Месцаў мадоннам зь дзецьмі
ніхто саступаць ня хоча.

На мёрзлых шыбах узоры –
лотаць, канвалі, ружа –
банальна зьвялі – *I’m sorry* –
ад рыму банальнага „сьцюжа”.

BOŻE NARODZENIE NA MURARSKIEJ ZAPRAWIE

Święta na Murarskiej Zaprawie.
Grudzień, czas na śnieżyce.
Madonnom ciężko brnąć w kurzawie
w zimnym świetle księżyca,

wlec się nieznajomym zaułkiem
z lipami po obu stronach.
Oto Kacper przemyka chyłkiem
wciskając głowę w ramiona,

oto Baltazar z bochnem chleba
i Melchior z kanką mleka
idą osiedlem pod ciemnym niebem,
może ktoś na nich czeka.


To odwieczna szaruga nasza,
nasz głód i chłód na sicher.
Wieje wietier made in Russia,
albo made in Poland wicher.

Pełznie ostatni trolejbus.
Następny – Murarska!
W środku zalany szajbus
wciąż trzyma się z dziarska.

Dziewuchy – cielę przy cielęciu –
bawią się w tomagochi.
Miejsca madonnie z dziecięciem
żadna ustąpić nie chocziet.

Na szybach zmarzniętych wzory –
konwalie, kaczeńce, róże –
zwiędły po prostu – I'm sorry –
od rymu prostego „w górze".

Зімна крохкім бутонам.
Парай плыве гаворка.
Над „Раствора-Бэтонным”
у небе спыняецца зорка.



Marzną pąki nad stawem.
Para otula rozmowy.
Dla Murarskiej Zaprawy
Bóg się rodzi na nowo.

Przełożył Jan Maksymiuk

БІЯТЛЁН

Бітма набіты агульны вагон
сьпяшаўся за лякаматывам,
быццам караван біятляністаў
за лідэрам у зялёных штанах.

„Глядзі, мы абагналі сьветлафор”, –
узрадаваўся дзіцячы голас.
Ніхто не спрачаўся,
бо мы й напраўду набралі хуткасьць,
пакідаючы стадыён.

Папсовая музыка з дынамікаў
падбадзёрвала,
як галасы трэнэраў.

Дрэвы мільгалі за вокнамі,
як засьнежаныя
скадынаўскія заўзятары.

Сёй-той загадзя
рыхтаваўся да прыпынку,
папраўляючы заплечнік,
нібы вінтоўку за сьпінай.

А ты глядзела праз акно
на галінкі ў карунках шэрані,
а пасьля рамантычна прамовіла:
„Які сьнег!
Як там цяпер добра!
Зусім як учора ў Обэрхофе,
па тэлевізары”.

Я падумаў, што так, цяпер добра.
У Обэрхофе.
У тэлевізары.
Учора.

BIATHLON

Zatłoczony ogólny wagon
podąża za lokomotywą,
jak karawana biathlonistów
za liderem w zielonych spodniach.

„Spójrz, wyprzedziliśmy reflektor" –
ucieszył się dziecięcy głos.
Nikt nie zaprzeczał,
rzeczywiście nabraliśmy szybkości,
zostawiając stadion.

Popowa muzyka z głośników
dodawała animuszu,
jak głosy trenerów.

Drzewa migały za oknami,
jak zaśnieżeni
skandynawscy kibice.

Ktoś zawczasu
przygotowywał się przed przystankiem,
poprawiając plecak,
jak karabin na plecach.

A ty patrzyłaś przez okno
na gałęzie w koronkach szronu,
a potem romantycznie powiedziałaś:
„Jaki śnieg!
Jak tam teraz dobrze,
całkiem jak wczoraj w Oberhofie,
w telewizorze".

Pomyślałem, że tak, teraz dobrze.
W Oberhofie.
W telewizorze.
Wczoraj.

Przełożył Bohdan Zadura

БАЛЯДА ПРА ТРЫЦЦАЦЬ ВОСЬМЫ ТРАЛЕЙБУС

Трыццаць восьмы тралейбус запальвае свае бартавыя агні:
няма чаго болей рабіць на прыпынку – лепей на вышыні.

Палёты ўзімку? Ніколі. Ясна і крумкачу.
Але ў кіроўцы тралейбуса калядныя зоры ўваччу.

Надвор'е шэпча – нялётнае, і праўды няма ў крыле,
і сьветлафор заікаецца на чырвоным сьвятле.

„Чырвоная Маска Сьмерці", – сказаў бы тут Эдгар По.
Але трыццаць восьмы тралейбус ня пойдзе сёньня ў дэпо.

У сьведкаў пад шапкай зімовай дыба ўстаюць валасы,
калі трыццаць восьмы ад ледзяной адрываецца паласы.

Як ад вальсу, галовы кружацца ў пасажыраў і іхных дам.
„Тралейбус ляціць у неба. Наступны прыпынак – там...

Не забывайце аплачваць, – чуецца, як пароль, –
на паветранай лініі сёньня працуе кантроль...

Забараняецца размаўляць з кіроўцам увышыні...
Пераканаўчая просьба мацней падцягнуць рамяні...

Не кампастуйце талёнаў, маючы праязны...
Саступайце анёлам сталага веку, інакш саступяць яны...

Бізнэс-кляса для пасажыраў зь дзецьмі ды інвалі..."
Болей абвестак зь неба не чуваць на зямлі...

Тралейбус ляціць уверсе, унізе плыве яго цень.
Нябесны дыспэтчар стаміўся лічыць:
    трыццаць восьмы тралейбус за дзень!

BALLADA O TROLEJBUSIE 38

Trolejbus trzydziesty ósmy zapala swoje pozycyjne światła,
co na postoju robić? – w przestworzach rzecz byłaby łatwa.

Latanie zimą? Nigdy. Potwierdzi to kruk każdy.
Lecz w oczach kierowcy błyszczą Bożonarodzeniowe gwiazdy.

Pogoda pieska – nie lotna i w skrzydłach brak pary na to,
światłem czerwonym się jąka świetlny sygnalizator.

„Czerwona Maska Śmierci" – Edgar Poe mógłby powiedzieć.
Lecz trolejbus 38 dzisiaj do zajezdni nie zjedzie.

Świadkom pod zimowymi czapkami dęba stają włosy,
gdy trzydziesty ósmy od oblodzonej odrywa się szosy.

Jak w walcu krążą głowy pasażerów i ich dam.
„Trolejbus wzbija się w niebo. Następny przystanek – tam…

Za przejazd stosowną opłatę uiścić należy –
dziś na tej powietrznej linii pracują kontrolerzy.

Rozmowa z kierowcą w czasie lotu wzbroniona. Uprasza
usilnie się pasażerów o zaciągnięcie pasów.

Nie kasuj biletu, jeżeli miesięczny masz ze sobą.
Ustąp miejsca starszym aniołom, inaczej oni to zrobią…

Bizness-class dla podróżnych z dziećmi i inwali…"
Więcej ogłoszeń na ziemi nie słychać z niebieskiej dali.

Trolejbus leci w górze, w dole płynie trolejbusu cień.
Niebieski dyspozytor przestał liczyć:
    38 trolejbus w jeden dzień!

Przełożył Bohdan Zadura

КАЛЯДНЫ РЭП

У краіне, дзе поўны тормаз націскае на тармазы;
дзе адно й тое самае сьвята адзначаюць чатыры разы,

каб насельнікі, як наркаманы, зноў і зноў адчувалі прыход
навагодняга сьвята зь вечна новай назваю „Новы год";

дзе фартуна, як сьнежная баба, усьміхнецца табе анфас,
павіншуе кожнай вітрынай: „с рождеством и калядами вас!"–

ты ня бачыш, ляціш на паўночных аленях у кірунку Караганды,
покуль Дзед Мароз барадою з ваты замятае твае сьляды.

І паўночнае зьзяньне ў вочы, і палярная зорка ўгары,
і на кожных санях сьвятога Міколы замежныя нумары.

І складаеш калядную песьню, і выходзіць сьнежаньскі рэп,
і сьпяваў бы, калі б ня поўнач і ня мінус сем на дварэ б.

Гэтай поўначы хопіць зь лішкам на астатнія паўжыцьця...
А назаўтра ў ясьлях выходны – толькі вол, ягня і дзіця.

Баю-бай, маленькі Ісусе,
ў Бэтлееме і ў Беларусі.

ŚWIĘTA NOWEGO ROCKU

W kraju, gdzie chamuła naciska na hamulec;
gdzie jedno święto się cztery razy w roku świętuje,

by jak narkoman odlotu doznawał człowiek każdy
na dźwięk nowej ciągle Nowego Roku nazwy;

gdzie śnieżnej baby uśmiechem fortuna cię obdarza
„niech wam się darzy" z witryn sklepowych jak z ołtarza;

nie widzisz tego, do Karagandy mknąc na reniferach,
gdy Dziadek Mróz brodą z waty twoje ślady zaciera.

I blask północny w oczach, gwiazdy polarnej błysk szczery,
na saniach świętego Mikołaja same obce numery.

I starą pastorałkę na Nowy Rock chcesz przełożyć.
Śpiewałbyś ją, gdyby nie północ i minus siedem na dworze.

Na pozostałe pół życia tę północ zachować pragniesz.
Nazajutrz w żłobku odświętnym – dzieciątko, wół oraz jagnię.

Lulaj lulaj maleńki Jezusie,
lulaj w Betlejem i na Białorusi.

Przełożył Bohdan Zadura

УЛАДЗІМЕР АРЛОЎ

МНЕ ПРЫСЬНІЎСЯ ХАДАНОВІЧ...

Мне прысьніўся Хадановіч:
Велічны, нібы сэнатар,
Недарэзаны Нэронам,
Іранічны, як Свэтоні,
Заклапочаны, як Брут.
Можа, сам каго зарэзаў,
Можа, вершык марыў скласьці,
А магчыма, проста піва
Прагнуў выпіць насупроць
Камітэту дзяржбясьпекі,
Дзе цікавяцца здаўна
Нашым паэтычным словам
І напэўна нездарма.
Ён ішоў па вулцы Маркса
Ў Менску, стомленым і сонным,
Між кавярняй „Эльдарада”
І ангельскай амбасадай
(Там у будцы мент сядзіць).
Рухаўся накіравана,
Не хістаўся, не губляўся,
Павітаўся з нарпаэтам
З рэдкім іменем на „Н”,
Даўганогай прыгажуні
Мімаходзь прызначыў стрэлку
І сказаў бамжу: „Банжур!”
Ён ішоў. Гракі крычалі
Ў навакольлі Нацтэатру.
(Ну чаму не груганы?)
Бомж чытаў паэта Ніцку,
Плакаў, языком мянціў.
Даўганогая бляндынка
Набыла кантрацэптыў,
Бо навокал СНІД лютуе,
А Андрэй – за ўсіх мудрэй.
Я прачнуўся і падумаў:

UŁADZIMIER ARŁOU

PRZYŚNIŁ MI SIĘ CHADANOWICZ...

Przyśnił mi się Chadanowicz:
Tak dostojny jak senator
Niedobity przez Nerona,
Ironiczny jak Swetoniusz,
Zatroskany tak jak Brutus.
Może kogoś zabił sam,
Może chciał ułożyć wierszyk,
Albo może chciał po prostu
Wypić piwa naprzeciwko
Gmachu służby KGB,
Gdzie od dawna się ciekawią
Naszym słowem poetyckim
I na pewno w jakimś celu.
Szedł uliczką pana Marksa
W Mińsku sennym i zmęczonym,
Między café „Eldorado"
I angielską ambasadą
(Tam jest budka z mundurowym.)
Szedł do przodu naumyślnie,
Nie chwiał się i nie wałęsał,
Się przywitał z jednym wieszczem
Co ma imię po Leninie,
Długonogiej krasawicy
Mimochodem randkę przyrzekł
I dziadowi rzekł „Bonżurek!"
Szedł. Gawrony sejmowały
Przy Teatrze Narodowym
(Nevermore? – słyszałem dobrze?)
Dziad Niczego rzeczy czytał,
Płakał, ględził sam do siebie.
Długonoga blond dziewoja
Nakupiła gumek Trojan,
Bo dokoła AIDS szaleje,
A Andrej jak nikt przezorny.
Obudziłem się i myślę:

Вось прысьніцца Хадановіч
Цёмнай ночкай на Каляды,
Без усякіх там прыколаў
Заклапочаны, як Брут.
Будзе йсьці па вулцы Маркса
З томам Малярмэ ў партфэлі
І часопісам „Arche”,
І з сухім ляшчом пад пахай.
Што адгэтуль вынікае?
Што паэту трэба муза,
А часамі прагне піва
Ўкрай асьмяглы арганізм.
І ляшчы яшчэ вядуцца
У вірох маёй Радзімы.
КДБ шануе мову,
І „Arche” выходзіць спраўна.
А бамжы чытаюць кнігі,
Знойдзеныя на памыйках.
Гэта значыць, што пісьменства
Наша краснае – жыве!

Oto śni się Chadanowicz
W ciemną nockę wigilijną
Bez wszelakich swoich zgrywów,
Zatroskany tak jak Brutus
Idzie po bocznicy Marksa
Z tomem Mallarmé w aktówce,
Z pismem literackim „Arche”
I wędzonym leszczem w garści.
Co wynika stąd dla wieszczów?
To że muzy im potrzebne
I że piwo też się przyda
Czy to z rana, czy pod wieczór.
To że leszcze wciąż się płodzą
W rozlewiskach mej ojczyzny.
KGB szanuje język,
„Arche” jeszcze nie zamknęli,
A włóczędzy chłoną książki
Znalezione na śmietnikach.
To oznacza, że pisarstwo
Nasze jeszcze nie zginęło!

Przełożył Jan Maksymiuk

Андрэй ХАДАНОВІЧ (1973, Менск) – беларускі паэт, перакладнік, эсэіст. Аўтар паэтычных кніг *Старыя вершы* (2003), *Лісты з-пад коўдры* (2004), *Землякі, альбо Беларускія лімэрыкі* (2005), *From Belarus with love* (2005). Перакладае з ангельскай, францускай, польскай, расійскай, украінскай. Выкладае літаратуру ў Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэце й Беларускім Нацыянальным Гуманітарным Ліцэі. Кіраўнік „Перакладніцкай Майстэрні" пры Беларускім Калегіюме (Менск). Сябра Саюзу пісьменьнікаў Беларусі й Беларускага ПЭН-Цэнтру. Арганізатар Літаратурнага конкурсу „Я маю твор..." для школьнікаў. Вершы Хадановіча перакладаліся на ангельскую, літоўскую, нямецкую, польскую, украінскую мовы.

Andrej CHADANOWICZ (1973, Mińsk) – białoruski poeta, tłumacz, eseista. Autor książek *Stare wiersze* (2003), *Listy spod kołdry* (2004), *Rodaki albo Białoruskie limeryki* (2005), *From Belarus with love* (2005). Tłumaczy z angielskiego, francuskiego, polskiego, rosyjskiego, ukraińskiego. Wykłada literaturę w Białoruskim Państwowym Uniwersytecie i Białoruskim Liceum Humanistycznym. Kierownik Pracowni przekładu przy Białoruskim Kolegium w Mińsku. Członek Związku Pisarzy Białorusi (zdelegalizowanego) i Białoruskiego PEN-Club. Organizator konkursu literackiego „Mam utwór…". Wiersze Chadanowicza były tłumaczone na angielski, litewski, niemiecki, polski i ukraiński.

ЗЬМЕСТ

SPIS TREŚCI



Pod patronatem Ministra Kultury
i Dziedzictwa Narodowego RP

Zrobił na mnie świetne wrażenie:
skłonny do uprawiania językowych kalamburów i żartów,
poważny w pryncypiach sztuki,
niezwykle oczytany w całej europejskiej tradycji,
bardzo też otwarty na dialog, inteligentny i sympatyczny.
Ktoś, z kim chciałoby się podróżować dookoła świata w 80 dni.

Paweł Huelle o Andreju Chadanowiczu